

Беларускі адрэзак гісторыі роду Дастаеўскіх налічвае толькі два стагоддзі. У сярэдзіне XVII ст., у час паўстання Хмяльніцкага, фальварак быў фактычна разбураны. Адрадзіць гаспадарку яны ўжо не змаглі.

СТАР. 3



Будаўніцтва ў Беларусі — стратэгічная галіна эканомікі. Будаўніцтва стварае своеасаблівы эфект мультыплікатара, бо кожнае новае працоўнае месца ў галіне стварае 2 працоўныя месцы ў эканоміцы.

СТАР. 3



На Палессі шмат старажылаў, якія жылі яшчэ ў тыя часы, калі яно было адрэзана балотамі ад усяго свету. Таму там збераглі шмат традыцый. На жаль, усё гэта ўжо сыходзіць...

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

11 ЖНІЎНЯ 2012 г. СУБОТА № 154 (27269) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**Працаўнікам будаўнічага комплексу Рэспублікі Беларусь**

*Паважаныя працаўнікі будаўнічага комплексу!*

*Віншую вас з прафесійным святам — Днём будаўніка.*

*Уменне будаваць ва ўсе часы было ў пашане, а людзі, якія валодаюць гэтым няпростым майстэрствам, заўсёды карысталіся павагай, таму што будаваць — значыць мяняць жыццё да лепшага і думаць пра будучыню.*

*Актыўная будаўнічая дзейнасць апошніх дзесяцігоддзяў садзейнічала фарміраванню сучаснага аблічча нашай краіны, якая арыентавана на сацыяльныя прыярытэты. Сведчаннем таму з'яўляецца шырока разгорнутае жыллёвае будаўніцтва, узвядзенне спартыўных збудаванняў, устаноў аховы здароўя, адукацыі і культуры, новых станцый метрапалітэна, мастоў, дарог, аўтатрас і важных прамысловых аб'ектаў. Вялікі ваш уклад у рэстаўрацыю і адраджэнне гістарычнай спадчыны.*

*Высокі прафесіяналізм беларускіх будаўнікоў вядомы не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі — у Расійскай Федэрацыі, Туркменістане і нават далёкай Венесуэле.*

*Поспехі мінулых гадоў даказваюць, што нашым працаўнікам будаўнічага комплексу па сілах вырашэнне самых адказных задач.*

*Шчыра жадаю вам здароўя, шчасця і новых дасягненняў на карысць роднай краіны.*

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Фота БЕЛТА.



**Камбайнер Міхаіл САЛАДУХА з агракамбіната «Ждановічы» першым у краіне пераадолеў 5-тысячны рубеж па намалоце збожжа. Міхаіл — безумоўны лідар уборачнай гарачай пары Міншчыны. Ён першым у вобласці пераадолеў і 2-, і 3-тысячны рубеж. А зараз у яго актыве — ужо больш за 5 тысяч тон збожжа.**

## ЛІЧБА ДНЯ

***27,3** тысячы беспрацоўных зарэгістравана за ліпень у цэлым па рэспубліцы. Гэтая лічба за месяц зменшылася на 600 чалавек. Дарэчы, калі прааналізаваць сітуацыю, што склалася на 1 жніўня на рынку працы краіны за апошнія пяць гадоў, то самая высокая колькасць беспрацоўных была на гэты дзень у 2007 годзе — 40,7 тыс. чалавек. На 1 ліпеня 2012 года на ўліку па беспрацоўі ў органах па працы, занятасці і сацабароне знаходзіліся 27,9 тыс. чалавек, колькасць зарэгістраваных беспрацоўных зменшылася за чэрвень гэтага года на 1,8 тыс. чалавек, за май — на 0,9 тыс. чалавек, за красавік — на 0,4 тыс.*

## НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 17 |
| Віцебск | + 16° |
| Гомель | + 21° |
| Гродна | + 16° |
| Магілёў | + 19° |
| Мінск | + 17 |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.08.2012 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 8310,00 ▼ |
| Еўра | 10190,00 ▼ |
| Рас. руб. | 260,50 ▼ |
| Укр. грыўня | 1026,05 ▼ |

# АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА АЖЫЦЦЯВІЎ СІМВАЛІЧНЫ ПУСК НОВАЙ ТЭХНАЛАГІЧНАЙ ЛІНІІ НА БЕЛАРУСКІМ ЦЭМЕНТНЫМ ЗАВОДЗЕ

Фота БЕЛТА.



**Такім чынам, дадзены старт новай сучаснай вытворчасці цэменту, якая наладжана з прыцягненнем кітайскіх інвестыцый.**

Па сутнасці, будаўнічая галіна Беларусі атрымала новае прадпрыемства магутнасцю каля 2 млн т цэменту ў год. Новая лінія дасць магчымасць павялічыць штогадовую вытворчасць цэменту ў Касцюковічах прыблізна да 3 млн т. Гэта дапаможа вырашыць праблему дэфіцыту цэменту на ўнутраным рынку, значна павялічыць яго экспарт, а таксама адкрые новыя перспектывы для развіцця прадпрыемства. Дзякуючы рэалізацыі гэтага інвестыцыйнага праекта, на прадпрыемстве з'явіцца больш за 200 новых рабочых месцаў.

З новай лініі Беларускага цэментнага завода ўжо адгружаны першыя вагоны цэменту. Як паказваюць лабараторныя аналізы, якасць атрыманага цэменту — высокая. Прычым расходы электраэнергіі пры вытворчасці істотна зніжаны.

Кітайская кампанія «Сіцік» рэалізуе ў Беларусі маштабную інвестыцыйную праграму па мадэрнізацыі цэментных заводаў і тэхналагічных ліній па выпуску цэменту.

Цэментная прамысловасць краіны прадстаўлена трыма прадпрыемствамі — у Краснасельску, Крычаве, Касцюковічах. Калі ў Краснасельску і Касцюковічах новыя тэхналагічныя лініі па вытворчасці цэменту «сухім» спосабам ужо запушчаны, то ў Крычаве стварэнне новай лініі будзе завершана вясной будучага года.

Як праінфармавалі Аляксандра Лукашэнку, увод новых тэхналагічных ліній па вытворчасці цэменту «сухім» спосабам дасць магчымасць істотна нарасціць вытворчасць канкурэнтаздольнай на знешніх рынках прадукцыі.

Аляксандр Лукашэнка прапанаваў Кітаю стварыць вытворчасць жалезабетонных вырабаў на базе Беларускага цэментнага завода. «Да новага года павінен быць бізнэс-план — наш або сумесны з Кітаем — па вытворчасці жалезабетонных вырабаў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён даручыў усё дасканала падлічыць і, зыходзячы з разлікаў, прымаць канчатковыя рашэнні наконт стварэння новай вытворчасці.

СТАР. 2

■ Жыццялюбы

# ШЧАСЦЕ ПА-КАМАРОЎСКУ

## Бізнэсмен з Камарова ведае, як прывабіць моладзь у вёску

**Вёска Камарова знаходзіцца прыблізна за 200 кіламетраў ад Мінска. Тым не менш, камароўцы (якіх каля 1000) не рвуцца ў сталіцу ў пошуках шчасця. Ды і навошта? Калі іх жыццё па выгодах не саступае мінскаму. Пагуляць можна па цудоўным парку з альпійскімі горкамі, адна з крам працуе да позняга вечара, ёсць міні-ГЭС, кавярня і нават пякарня... І гэта, пераконвае мясцовая сям'я Вайцяховічаў (менавіта дзякуючы ёй Камарова змянілася да непазнавальнасці), толькі пачатак.**



Эдуард і Ала ВАЙЦЯХОВІЧЫ не сумняваюцца, што створаць вёску сваёй мары.

### «ЖЫЦЬ У ВЁСЦЫ — СУЦЭЛЬНАЯ ВЫГАДА!»

— Людзі, пакуль не прыедуць і не пабачаць, не вераць, што так можна жыць у вёсцы, — усміхаецца Эдуард Вайцяховіч. — Мець уласны дом з усімі выгодамі і газонам, ездзіць на добрай машыне, есці свежаспечаны хлеб зранку. І пры гэтым грошы нармальныя зарабляць. Я ўсім адкрыта гавару, што наша сям'я летась, пэўна, мільёнаў 120 зарабіла на сельскім турызме. Жыць у вёсцы лепш, камфортней. А ў нашых людзей чамусьці такое паняцце, што шчасце — у Мінску на 10-м паверсе ў двухпакаёвай кватэры.

Эдуард Антонавіч заглушае матор і запрашае мяне ў «Цэнтр развіцця сельскага прадпрымальніцтва «Камарова», які разам з жонкай стварыў 8 гадоў таму. Там у зале, аформленай на еўрапейскі манер, за кубачкам кавы і падзяліўся сваімі грандыёзнымі задумамі.

СТАР. 2

# Міхась МІЦКЕВІЧ: «КУПАЛА І КОЛАС — ІХ НЕ ПАДЗЕЛІШ...»

**У памяць пра першую сустрэчу Песняроў устаноўлены памятны знак.**

Смольня, дзе знаходзіцца адзін з філіялаў мемарыяльнага музея Якуба Коласа, адзначана памяццю яшчэ і пра Янку Купалу. Хатка, куды Колас прыязджаў да сваіх сваякоў, захоўвае памяць пра тое, што менавіта сюды ў жніўні 1912 года прыйшоў на сустрэчу з ім Янка Купала. Менавіта тут 100 гадоў таму на пачатку жніўня адбылася першая сустрэча беларускіх Песняроў. Першая вочная сустрэча, таму што яны ўжо выдатна ведалі адзін аднаго — дзякуючы творам, па публікацыях. І нават на адлегласці гэтыя два чалавекі не маглі не адчуць, што іх аб'ядноўвае. Іх аб'яднала літаратура. Але іх аб'яднала і краіна, якую яны будавалі праз свае творы і ідэі, якія ў іх выказвалі.

Міхась Міцкевіч, сын Якуба Коласа, адзначыў на адкрыцці мемарыяльнага знака:

— 100 гадоў таму адбылася вялікая падзея ў жыцці нашага народа, калі сустрэліся два маладыя паэты, якія, па сутнасці, заснавалі новую літаратурную беларускую мову і ўнеслі велізарны ўклад у культуру нашага народа. Бывалі такія пытанні, хто з іх першы. Але добры адказ даў Максім Лужанін у сваім вершы: «Купала і Колас — іх не падзеліш. Колас з Купалам — адна сцяна». Пра падзею сустрэчы Песняроў напісана некалькі вершаў...

Абодва Песняры натхняюць і зараз. Творцаў, чытачоў, людзей, якія прыходзяць у музеі, каб даведацца пра іх.

Зінаіда Камароўская, дырэктар музея імя Якуба Коласа:

— Тая сустрэча паклала падмурак іх цёпламу, шчыраму сяброўству. Таму сумесна са Стаўбцоўскім райвыканкамам мы адзначылі гэтую падзею ў філіяле музея Якуба Коласа ў Смольні. Гэта яшчэ адна магчымасць прыцягваць сюды наведвальнікаў: той, хто ступіць на гэтую зямлю, стане добрым сябрам, а калі прыходзяць маладыя, кампаніяй, з сябрамі, то захаваюць адносіны на ўсё жыццё...

Падрабязней пра гэтую падзею мы распавядзём у наступным нумары.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**



# 5-е МЕСЦА: ЗА ПАЎКРОКА ДА МЕДАЛЯ

## Спецыяльны карэспандэнт «Звязды» перадае з Лондана

Алімпійскія гульні ў Лондане набліжаюцца да свайго лагічнага завяршэння. І гэта відаць не толькі па запрашальных білетах на закрыццё Гульняў, якія ўжо ў многіх журналістаў і спартсменаў на руках, але і па іншых паказчыках. Напрыклад, на вуліцах брытанскай сталіцы ўсё менш чуваць паліцэйскіх аўтамабіляў, якія з раніцы разразаюць паветра гулкімі сірэнамі. З-за такіх манеўраў стражаў правапарадку грамадскі транспарт на некалькі хвілін спыняецца: аўтобусы і таксі рэзка прымаюць управа, каб прапусціць паліцэйскіх. Правам першачарговага праезду карыстаюцца і аўтамабілі хуткай дапамогі. Раз-пораз яны таксама пралятаюць, спяшаючыся на тэрміновы выклік. Што тычыцца спецыяльнай алімпійскай паласы для абслугоўвання журналістаў, спартсменаў і афіцыйных гасцей алімпіяды — то гэта сапраўдная палачка-выручалачка. На гэтую дарогу іншаму транспарту выязджаць забаронена. Хоць, шчыра кажучы, знаходзіцца нямала смельчакоў, якія рызыкуюць не толькі перасячы тлустую белую паласу, якая часова раздзяляе вадзіцеляў на катэгорыі важнасці, але і рухацца па ёй. Пры гэтым яны імкнуцца як мага хутчэй зрабіць неабходны манеўр, каб паспяхова пакінуць затор. Але ж тут ліхачоў чакаюць відэакамеры, якія не толькі вядуць запіс, але і фатаграфуюць парушальнікаў. На першы раз — штраф у 130 фунтаў. А вось да аўтамабіляў з сімволікай Алімпіяды ставяцца па-іншаму. Адзін з беларускіх трэнераў па веславанні на байдарках і каноэ, калі мы вярталіся з вяслярнага канала мястэчка Ітон Доўні, паведаў шмат чаго цікавага. Паводле яго слоў, напярэдадні ў горадзе аўтамабіль, які абслугоўваў беларускую каманду, быў прыпаркаваны з парушэннем правілаў. Да таго ж час стаянкі аўто (у сярэднім 2 гадзіны) быў значна пратэрмінаваны. Прыбыўшы на месца, беларусы знайшлі запіску, што за парушэнне правілаў паркоўкі і пратэрміноўку неабходна заплаціць штраф у 205 фунтаў. А для таго, каб чалавеку (перад тым, як пакінуць паркоўку) не забыць аплаціць штраф, у пісьме ў якасці доказу было прадстаўлена фота машыны і рэгістрацыйны нумар адпаведна. Што называецца, факт бясспрэчны. Зразумела, нашы трэнеры вымушаны былі звярнуцца да паліцэйскіх, каб панесці заслужанае пакаранне. Якім было іх здзіўленне, калі ў аддзяленні паліцыі беларусам сказалі, што на першы раз ім даруюць такую выхадку (усё ж такі алімпійцы), а вось у наступны раз літасці не будзе. Пэўна, такі захад вартавых лонданскіх дарог служыць добрым урокам у замацаванні правілаў дарожнага руху ў свядомасці кожнага вадзіцеля. І чалавеку прыемна, і плён ад такой павучальнай гутаркі намнога большы.

Праўда, гэтыя ўрокі менш за ўсё тычацца веласіпедыстаў, якія кожную раніцу ўтвараюць заторы каля святлафораў, і пешаходаў. Пра апошні кантынгент — размова асаблівая. Тут мала хто выконвае патрабаванні дарожных знакаў і святлафораў. Пераходзяць тады, калі захочуць, і там, дзе ўздумаецца. Галоўнае, паглядзець спачатку направа, а потым — налева. Калі аўтамабілісты яшчэ спыняюцца, каб прапусціць пешага парушальніка, то веласіпедысты і не збіраюцца рабіць добры жэст. У гэтым кожную раніцу могуць пераканацца беларускія журналісты, якія ўжо два тыдні жывуць ва ўніверсітэцкім інтэрнаце і паўкіламетра пешшу дабіраюцца да часовай аўтобуснай станцыі, адкуль «шатлы» ідуць на ўсе алімпійскія аб'екты.

СТАР. 2

ISSN 1990 - 763X

**Дарагія калегі і партнёры, паважаныя работнікі ААТ «Краснасельскбудматэрыялы» і ветэраны працы!**
**Віншую вас з прафесійным святам — Днём будаўніка!**



Адкрытаму акцыянернаму таварыству «Краснасельскбудматэрыялы» выпала адна з найважнейшых і адказных сацыяльных місій — выпуск высакаякаснай, канкурэнтаздольнай прадукцыі для будаўніцтва і добраўпарадкавання нашага агульнага дома — роднай Беларусі. На працягу ўсёй сваёй гісторыі, пачынаючы з 1914 года, наша прадпрыемства дасягала пастаўленых мэт, адказвала на выклікі часу і трымала высокую марку якасці. Усе гэтыя поспехі — заслуга згуртаванага працоўнага калектыву, які сваім сумленным і адказным стаўленнем да працы заваёўваў прызнанне і аўтарытэт роднаму прадпрыемству. Таму хочацца асабліва адзначыць працу гэтых людзей, выказаць сардэчную ўдзячнасць ветэранам нашага акцыянернага таварыства, якія перадаюць свой багаты вопыт моладзі, за ўдзел у захаванні і развіцці славутых працоўных традыцый.

Дзякуй усім дзелавым партнёрам за адказнасць у сумеснай працы, за тую ступень даверу, якую прадпрыемства мае сёння. Бо для нас лепшая пахвала — гэта адабрэнне калег і шчырая падзяка заказчыкаў за высокую якасць нашай прадукцыі.

Зычу вам далейшых прафесійных поспехаў у вашай высакароднай працы, невычэрпнай творчай энергіі, асабістага шчасця і дабрабыту, моцнага здароўя вам і вашым сем'ям!

Валянцін ВЕРАЦІЛА, генеральны дырэктар ААТ «Краснасельскбудматэрыялы».



# Новая стратэгія галіны: БУДАВАЦЬ ДОМА І ЗАРАБЛЯЦЬ ГРОШЫ ЗА МЯЖОЙ

**Будаўніцтва ў Беларусі — стратэгічная галіна эканомікі. У ёй дзейнічае каля 4 тысяч суб'ектаў гаспадарання розных формаў уласнасці. Будаўніцтва стварае своеасаблівы эфект мультыплікатара, бо кожнае новае працоўнае месца ў галіне стварае 2 працоўныя месцы ў эканоміцы.**



**На пытанні карэспандэнта «Звязды» адказвае міністр архітэктуры і будаўніцтва Беларусі Анатоль НІЧКАСАЎ.**

**— Анатоль Іванавіч, мінулы год быў даволі складаны для эканомікі краіны. Як перажылі яго будаўнікі?**

— І сапраўды, тыя часы былі сур'ёзнай праверкай на трываласць усяго будаўнічага комплексу. Нягледзячы на аб'ектыўныя цяжкасці, агульная сітуацыя ў эканоміцы амаль не паўплывала адмоўна на дзейнасць будаўнічых арганізацый. Летась мы вытрымалі, а сёлета ў першым паўгоддзі ўжо змаглі стабілізаваць дзейнасць вытворчасці і будтрэстаў.

**— Аб чым сведчаць вынікі дзейнасці будгаліны ў першым паўгоддзі?**

— У студзені—чэрвені 2012 года было ўведзена ў эксплуатацыю 2 млн 469,1 тысячы квадратных метраў жылля, што складае амаль 60% ад гадавога задання. Статыстыка сведчыць, што ў першым паўгоддзі было пабудавана на 17,6 працэнта больш, чым запланавана. На жыллёвае будаўніцтва выкарыстана больш за 10 трлн рублёў інвестыцый. На будаўніцтва аб'ектаў інжынернай і транспартнай інфраструктуры да раёнаў жылой забудоўлі накіравана 1,6 трлн рублёў, або 71 працэнт ад прадугледжанага аб'ёму на 2012 год.

Падобная дынаміка дае падставу спадзявацца, што ў трэцім квартале ў жыллёвым будаўніцтве можна чакаць сапраўды пазітыўнага прарыву. Калі прадпрыемствы і трэсты будаўнічага комплексу, а таксама падведамныя арганізацыі выканкамаў будуць так зладжана працаваць і далей, то гадавое заданне магчыма выканаць і раней.

На мой погляд, з улікам розных дадатковых крыніц фінансавання і рэгіянальных ініцыятыў, сёлета ёсць магчымасць пабудаваць нават каля 4,5 млн квадратных метраў жылля.

**— Колькі і па якім кошце сёлета было пабудавана жылля для чаргавікоў?**

— Адным з прыярытэтаў сацыяльнай палітыкі нашай дзяржавы з'яўляецца забеспячэнне жыхароў Беларусі даступным і камфортным жыллём.

У першым паўгоддзі для грамадзян, якія знаходзяцца на ўліку асоб з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў, усяго было ўведзена ў эксплуатацыю 1 млн 431 тысяча квадратных метраў жылля (57,9 працэнта ад гадавога задання), у тым ліку ў шматкватэрных жылых дамах 1 млн 55 тысяч кв. метраў. Меры па рэгуляванні кошту жылля, якое будуецца з дзяржпадтрымкай, дазволілі забяспечыць сёлета цану квадратнага метра агульнай плошчы ў даступных для насельніцтва параметрах. Так, у першым паўгоддзі сярэдні кошт жыллёвага «квадрата» для жылля, што будавалася з дзяржпадтрымкай, склаў 3 млн 108 тысяч рублёў.

**— Дзе і ў якіх аб'ёмах беларускія спецыялісты ажыццяўляюць будаўніцтва за мяжой? На якім узроўні назіраецца экспарт будаўнічых матэрыялаў?**

— У першым паўгоддзі прамысловасць будаўнічых матэрыялаў павялічыла аб'ём сваіх паставак прадукцыі за мяжу, у параўнанні з адпаведным перыядам летась, адразу на 45 працэнтаў. Было экспартавана тавараў на агульную суму 240 млн долараў. Сёння для нас гэта своеасаблівы рэкорд. Разам з тым, трэба памятаць, што гадавы паказчык па экспарце прадпрыемствам галіны даведзены да ўзроўню 590 працэнтаў у параўнанні з 2011 годам. Гэта сапраўды грандыёзная задача, але і яе магчыма выканаць.

Будаўнічыя арганізацыі істотна павялічылі экспарт паслуг. Заўважу, што гэта паслугі не толькі будаўнічыя, але і інжынерныя, праектныя і архітэктурныя. Мы спадзяёмся павялічыць экспарт паслуг у шэраг расійскіх рэгіёнаў, дзе ўжо падпісаны мемарандумы, пагадненні і кантракты на даволі вялікія сумы.

Акрамя Расіі, будаўнічыя паслугі наша краіна пастаўляе ў Венесуэлу, Туркменістан, Таджыкістан, Літву, Чэхію і Украіну. Зараз вядуцца кансультацыі аб супрацоўніцтве Беларусі і Эквадора.

Амбіцыйныя праекты беларускія будаўнікі плануюць рэалізоўваць у Башкірыі. Ужо падпісана папярэдняе пагадненне аб узвядзенні там жылля. Разглядаецца варыянт праектавання і будаўніцтва ў Башкортастане домабудаўнічага камбіната. Наша краіна мае багаты вопыт дзейнасці ў гэтым кірунку.

Сёлета ў Венесуэле намі было ўведзена ў эксплуатацыю ўжо тры заводы. Адзін завод нават па еўрапейскіх мерках лічыцца даволі вялікім, бо магутнасць яго складае каля 25 млн штук цэглы.

Быў пабудаваны завод па зборцы трактароў маркі МТЗ. Трэці пабудаваны намі завод прадугледжвае зборку аўтамабіляў МАЗ. Зараз будуецца і чацвёрты завод, дзе будзе ажыццяўляцца зборка дарожна-будаўнічай тэхнікі на базе тэхнікі маркі АМКАДОР.

Непасрэдна ў Венесуэле пад кіраўніцтвам беларускіх спецыялістаў узводзяцца цэлыя жылыя кварталы.

Заўважу, што перад нашым міністэрствам пастаўлена задача — пабудаваць да 2015 года 1 мільён квадратных метраў жылля за мяжой.

Адной з адметнасцяў экспарту будаўнічых паслуг Беларусі з'яўляецца экспарт навуковых распрацовак. Гэта мадэрнізацыя канструктыўных тэхналагічных сістэм жылых будынкаў, распрацоўка тэорыі і практычнага развіцця гарадоў і паселішчаў на базе комплекснай рэканструкцыі. На экспарт прапануюцца распрацоўкі па стварэнні новых канструктыўных сістэм жылых дамоў для сельскай мясцовасці з выкарыстаннем мясцовых будаўнічых матэрыялаў, у тым ліку там, дзе прадугледжваюцца аднаўляльныя крыніцы энергіі.

**— Калі і якім чынам плануецца ажыццявіць пераход на будаўніцтва жылля для грамадзян ільготных катэгорый па дзяржаўным заказе?**

— Так, мы звярнулі сур'ёзную ўвагу на эфектыўнасць выкарыстання фінансавых сродкаў дзяржаўнай падтрымкі ў форме льготных крэдытаў. Ужо ў наступным годзе запланаваны пераход на будаўніцтва жылля для чаргавікоў-ільготнікаў па дзяржаўным заказе.

**ГАЛОЎНЫМІ ПЕРАВАГАМІ МЕХАНІЗМУ ДЗЯРЖАЎНАГА ЗАКАЗУ БУДУЦЬ:**

**— бесперапыннае фінансаванне працэсу будаўніцтва;**

**— безумоўнае забеспячэнне нарматыўных тэрмінаў будаўніцтва;**

**— увод жылля па фіксаваных цэнах;**

**— выкарыстанне найбольш рацыянальных праектаў жылых дамоў, у першую чаргу сістэм БПД;**

**— выключэнне ўдзелу грамадзян з інвестыцыйнага працэсу будаўніцтва і выдзяленне ім гатовага жылля.**

Асобна адзначу, што новы парадак прадугледжвае даведзенне да рэгіёнаў аб'ёмаў дзяржаўнага заказу з вызначэннем гранічнага кошту будаўніцтва 1 квадратнага метра агульнай плошчы жылога памяшкання. Праект указа па гэтым пытанні ўжо падрыхтаваны і накіраваны на ўзгадненне. Укараненне сістэмы дзяржзаказу ў льготным жыллёвым будаўніцтве прадугледжана Канцэпцыяй дзяржаўнай жыллёвай палітыкі на 2012—2015 гады.

**— Колькі жылля плануецца пабудаваць у нашай краіне ў наступныя гады?**

— У праекце Канцэпцыі дзяржаўнай жыллёвай палітыкі Беларусі на 2012—2015 гады на 2013 год прадугледжаны ўвод у эксплуатацыю жылля ў аб'ёме 6,5 млн квадратных метраў агульнай плошчы, у тым ліку 2,5 млн кв. метраў жылля, што будуецца з дзяржаўнай падтрымкай.

Паводле прагнозу, які быў узгоднены з Мінэканомікі, на 2013 год вызначаны разліковы паказчык кошту жыллёвага «квадрата», што будуецца з дзяржпадтрымкай, — 4,6 млн рублёў.

Акрамя таго, праект канцэпцыі прадугледжвае будаўніцтва жылля ў 2014 годзе ў аб'ёме 8,5 млн кв. метраў, а ў 2015 годзе — 9,5 млн кв. метраў.

**— Якім чынам ажыццяўляецца ўкараненне інавацыйных распрацовак у вашай галіне?**

— У першым паўгоддзі намецілася станоўчая дынаміка скарачэння колькасці стратных арганізацый, павялічылася ўдзельная вага інавацыйнай прадукцыі. Змяншаюцца складскія запасы. Рэалізацыя інвестыцыйных праектаў на прадпрыемствах галіновай прамысловасці павінна прывесці да зніжэння ўжо ў 2012 годзе ўзроўню энергаспажывання на 20—25 працэнтаў.

Сёлета Мінбудархітэктуры павінна завяршыць 6 інвестпраектаў. Гэта пры тым, што цяпер ажыццяўляецца рэалізацыя 10 праектаў — у межах розных дзяржаўных праграм. Самыя значныя з іх — мадэрнізацыя трох цэментных заводаў Беларусі. Ужо ўведзена тэхналагічная лінія магутнасцю 1,8 млн тон цэменту ў год на акцыянерным таварыстве «Краснасельскбудматэрыялы». Пачала працаваць новая лінія на Беларускім цэментным заводзе. Да канца года разлічваем увесці ў эксплуатацыю лінію на «Крычаўцэментнашыфер». Пасля гэтага агульны аб'ём вытворчасці заводаў складзе каля 10 мільёнаў тон цэменту за год.

Зараз працягваецца будаўніцтва лініі па вытворчасці даламіту для шкляной прамысловасці на акцыянерным таварыстве «Даламіт», арганізуецца вытворчасць шклаваты на ААТ «Шклозавод Нёман», ідзе мадэрнізацыя вытворчасці на ААТ «Гомельшкло».

Магутнасці, створаныя на прамысловых прадпрыемствах, дазваляюць выпускаць больш як 130 відаў будаўнічых матэрыялаў і вырабаў, якія экспартуюцца на рынкі блізкага і далёкага замежжа. А ўвод у эксплуатацыю дадатковых магутнасцяў па вяжучых, нярудных і сценавых матэрыялах дазволіць ужо сёлета павялічыць экспартны патэнцыял на 50—60 працэнтаў.

Заўважу, што толькі з пачатку года ў 4 разы павялічыліся экспартныя пастаўкі цэменту. Больш чым у 2 разы павялічылася адгрузка будаўнічых нярудных матэрыялаў і зборных жалезабетонных канструкцый і вырабаў.

**— Якія заробкі сёння ў айчынных будаўнікоў? Ці існуе ў галіне кадравы голад?**

— Так. У сувязі з павелічэннем аб'ёмаў будаўніцтва, а таксама з немагчымасцю летась павялічваць заробкі ў будаўніцтве праблема замацавання кадраў сапраўды стала актуальнай. Для спынення адтоку падрыхтаваных спецыялістаў за мяжу і павелічэння матывацыі працы Мінбудархітэктуры вызначыла шэраг захадаў па захаванні кваліфікаваных кадраў на вытворчасці. Сёлета ў сакавіку мы пачалі паэтапна павялічваць заработную плату працаўнікам будаўнічых арганізацый. Загадам Мінбудархітэктуры № 95 было дазволена арганізацыям, у межах каштарыснага кошту аб'ектаў, атрымліваць ад заказчыкаў сродкі для стымулявання выплат у памеры 100 працэнтаў ад каштарыснай асноўнай заработнай платы работнікаў і павялічыць памеры заробкаў будаўнікам на 30—40 працэнтаў у залежнасці ад эфектыўнасці працы. Потым загадам Мінбудархітэктуры быў вызначаны дадатковы каэфіцыент да рэсурсна-каштарысных нормаў на асобныя найбольш запатрабаваныя і нізкааплатныя грамадскія работы (усе віды кладкі, маналітныя і тынковачныя работы). Пасля прыняцця гэтых рашэнняў заробак у галіне павялічыўся.

Менавіта гэтыя захады міністэрства ў комплексе з выкананнем заданняў па росце прадукцыйнасці працы дазволяць ужо напрыканцы 2012 года выйсці на ўзровень заробкаў у будаўніцтве 500 і больш долараў.

Важную ролю адыгрывае і станоўчае вырашэнне жыллёвых праблем будаўнікоў. Цяпер арганізацыі, якія атрымліваюць прыбыткі, маюць магчымасць даваць сваім работнікам пазыкі на будаўніцтва жылля.

Ёсць і іншае выйсце ў кадравай праблеме. Арганізацыям трэба самім наладжваць планавы выезд беларускіх будаўнікоў за мяжу. Гэта дазволіць не толькі ўмацаваць фінансавы стан будтрэстаў і прыцягнуць валютныя рэсурсы ў краіну, але і забяспечыць працаўнікоў годнымі заробкамі. Дзеля гэтага Мінбудархітэктуры пачало шукаць новыя рынкі аказання будаўнічых паслуг за межамі Беларусі, у тым ліку праз стварэнне філіялаў і прадстаўніцтваў на тэрыторыі іншых дзяржаў. Будаўнічыя аб'яднанні пачалі ўдзельнічаць ва ўсіх выгадных конкурсах і тэндарах, якія праводзяцца ў гэтых краінах. Адзначу, што цяпер будаўнічыя арганізацыі ўзводзяць жыллё і прамысловыя аб'екты на тэрыторыі Расіі, Польшчы, Літвы, Латвіі, Венесуэлы, пачынаюць асвойваць рынкі Туркменістана і Азербайджана.

Наконт заробкаў. Апошнім часам яны істотна павялічыліся. Зараз памер сярэдняй заработнай платы па галіне складае каля 4,5 млн рублёў. У буйных і перадавых арганізацыях заробкі работнікаў значна большыя.

**— Днямі чуў навіну, што беларускія «шабашнікі» пачалі нават з-за мяжы вяртацца дадому.**

— Гэта сапраўды так. Адток кадраў за мяжу цалкам спыніўся. Сёння ў будаўнічай галіне працуе 218 тысяч чалавек. За мінулыя паўтара года за мяжу выехала неарганізаваным шляхам каля 43 тысяч будаўнікоў рознай кваліфікацыі. Але далёка не ўсе з іх адшукалі вартую працу. Частка тых будаўнікоў сёння вяртаецца дамоў.

Лепш усё рабіць арганізавана. Калі работнік мае намер працаваць за мяжой, то гэта ён можа зрабіць праз любы трэст. У гэтым выпадку ён гарантавана атрымае афіцыйны заробак, які будзе своечасова выплачвацца, і не трэба будзе хвалявацца за бытавыя ўмовы і сацыяльныя гарантыі. Адзначу, што арганізацыямі міністэрства заключаны 122 дагаворы падраду на работу беларускіх будаўнікоў за мяжой (галоўным чынам, у РФ). Гэта нармальна, бо, паводле статыстыкі, у Расіі не хапае каля 2,5 млн будаўнікоў.

**— Дзякуй за гутарку. Поспехаў вам. Віншуем вас і ўсіх будаўнікоў з прафесійным святам.**

**Падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.**

## ПАВАЖАНЫЯ КАЛЕГІ!

***Прыміце самыя цёплыя і сардэчныя віншаванні з нагоды прафесійнага свята — Дня будаўніка.***

***Ва ўсе часы праца стваральнікаў карысталася заслужаным прызнаннем і павагай. Сённяшні дзень — не выключэнне. Прафесія будаўніка, якую нездарма называюць самай мірнай, па-ранейшаму ў пашане.***

***Дзякуючы вашай працавітасці, вопыту і таленту наша краіна імкліва пераўтвараецца — актыўна вядзецца жыллёвае і прамысловае будаўніцтва, узводзяцца сучасныя школы і дзіцячыя сады, бальніцы і паліклінікі, спартыўна-аздараўленчыя комплексы, а таксама многія іншыя аб'екты, без якіх немагчыма ўявіць паўнацэннае і годнае жыццё сучаснага чалавека. У апошнія гады высокую ацэнку сваёй працы беларускія будаўнікі атрымліваюць і за мяжой, працуючы на аб'ектах самай рознай ступені складанасці. У нас нямала прычын ганарыцца сваёй працай! Выказваю ўпэўненасць, што і ў будучыні, дзякуючы прафесіяналам, будаўнічая галіна будзе развівацца дынамічна.***

***Прыміце шчырыя словы ўдзячнасці за стваральную працу, адданасць любімай справе. Зычу вам здароўя, дабрабыту і стабільнасці, дасягнення новых прафесійных вышынь!***

**А.І. НІЧКАСАЎ, міністр архітэктуры і будаўніцтва.**

# ДАСТОЕВА І ЎВЕСЬ СВЕТ

## У ІВАНАЎСКІМ РАЁНЕ БУДЗЕ АДНОЎЛЕНА РАДАВОЕ ГНЯЗДО ДАСТАЕЎСКІХ

Шэсць гадоў таму, калі я ўпершыню прыязджала ў Дастоева, туды толькі прывезлі жалуды ад дуба, які расце над магілай Дастаеўскага ў Аляксандра-Неўскай лаўры. Аказваецца, яшчэ жонка Фёдара Міхайлавіча Ганна Рыгораўна прасіла развеяць жалуды на радзіме продкаў мужа. У Іванаўскі раён іх прывёз піцерскі прафесар Сяргей Бялоў. Жалуды пасадзілі каля помніка пісьменніку з намерам рассадзіць потым дрэўцы. І вось цяпер дубкі растуць на месцы былой радавой сядзібы Дастаеўскіх. Тады мы з Анатолем Бураком, галоўным захавальнікам музея, гаварылі, што адраджэнне сядзібы — ідэя з вобласці фантастыкі. А цяпер яна на нашых вачах набывае рэальныя рысы. Усё мяняецца...

Мужчынская лінія продкаў роду Дастаеўскіх вядзецца ад мурзаў Залатой Арды, як, дарэчы і тутэйшых выхадцаў Ордаў. Аб гэтым ёсць падрабязныя звесткі ў кнізе Анатоля Федарука «Старадаўнія сядзібы Берасцейшчыны» і ў іншых працах. Але так было не заўсёды. Да 1960-х гадоў ніхто нават не згадваў пра сувязь іванаўскай вёскі з імем сусветна вядомага пісьменніка. Менавіта напрыканцы 1960-х у Дастоева прыехаў новы дырэктар школы Мікалай Паўлавіч Раманаў з жонкай Людмілай Лявонцьеўнай. Яны і пачалі актыўныя пошукі матэрыялаў пра род Дастаеўскіх, наладзілі перапіску з нашчадкамі пісьменніка, даследчыкамі яго творчасці.

Знайшліся дакументальныя сведчанні, паводле якіх яшчэ 500 гадоў таму продак аўтара бессмяротных твораў пачаў будаваць маёнтак на землях, якія атрымаў у дар ад князя Фёдара Яраслававіча. Звалі таго продка Даніла Рцішчаў. Ужо ў Дастоеве ў яго нарадзіліся два сыны. Аднаму з іх, Івану, далі двайное прозвішча Рцішчаў-Дастоеўскі. Кажуць, і сам вялікі пісьменнік настойваў на тым, каб яго прозвішча вымаўлялі з націскам на другім складзе — Дастоеўскі. Знайшліся і ўспаміны жонкі Ганны Рыгораўны, дзе яна адзначала: «Мой нябожчык муж шмат разоў казаў, што род яго паходзіць са старажытнай Літвы, ад пінскага маршалка Пятра Дастоеўскага, выбранага ў Сейм у 1589 годзе. Сам Пётр Дастоеўскі і яго нашчадкі жылі ў Дастоеве».

Праўда, беларускі адрэзак гісторыі роду налічвае толькі два стагоддзі. У сярэдзіне XVII ст., у час паўстання Багдана Хмяльніцкага, фальварак быў фактычна разбураны. Адрадзіць гаспадарку Дастоеўскія ўжо не змаглі. Не здолелі яны заплаціць падаткі ў казну і вымушаны былі з'ехаць. Прытулак знайшлі на Валыні — там продкі будучага генія пражылі каля трох стагоддзяў.

Пра ўсё гэта вельмі цікава расказвае Анатоль Бурак, настаўнік Дастоеўскай школы. Менавіта ён працягнуў справу сваіх настаўнікаў Раманавых, калі яны пайшлі на пенсію і з'ехалі да дзяцей. Выхадзец з тутэйшых мясцін, сапраўдны сельскі інтэлігент, Анатоль Іосіфавіч усімі сіламі прывівае сваім вучням цягу да вывучэння творчай спадчыны вялікага мысліцеля і гуманіста. А ва ўсіх наведвальнікаў, іх тут бывае да трох тысяч у год, ён спрабуе абудзіць цікавасць. Дастоеўскі-гісторык увесь час праводзіць думку, што сапраўдны геній — з'ява інтэрнацыянальная. Вось і Дастаеўскі паходзіць з Беларусі, продкі рассяліліся па Украіне, жыў увесь час у Расіі, а ідэі яго актуальныя і зразумелыя для людзей усяго свету. «Калі няма Бога, значыць, усё дазволена...», «У свеце ідзе адна вялікая бітва паміж дабром і злом» — не важна, на якой мове гэта было напісана, яно зразумела і блізка ўсім людзям.

Калі афармлялі школьны музей, Анатоль Іосіфавіч настаяў, каб у цэнтральнай яго зале знакамітае выказванне Дастаеўскага «Жыццё куды багацейшае за нашы выдумкі... Ніякае ўяўленне не прыдумае вам таго, што дае самае звычайнае жыццё» змясцілі на роднай мове. Колькі было тады апанентаў, што патрабавалі цытаваць класіка на мове арыгінала! Нічога, сцярпелі і звыкліся.

Анатоль Бурак расказвае, што летась школьны музей перажыў наваселле, пад экспазіцыю выдзелены новы прасторны пакой. Наведвальнікаў становіцца ўсё больш. Канферэнцыі па творчасці аўтара «Злачынства і пакарання», «Ідыёта», «Братоў Карамазавых» сталі штогадовымі і міжнароднымі. Арганізоўвае навуковыя форумы філфак Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта. У Дастоева кожную восень прыязджаюць навукоўцы з розных краін. Цяпер, праўда, і дастоеўцаў запрашаюць у Маскву, іншыя гарады, дзе шануюць памяць Фёдара Міхайлавіча. Вось і ў гэтым красавіку дэлегацыя з Іванаўскага раёна пабывала на кірмашы сацыяльна-педагагічных ідэй у Атрадным пад Самарай.

Пра Дастоева добра ведаюць нашчадкі пісьменніка. Унук яго, Андрэй Фёдаравіч, актыўна перапісваўся з музеем, вельмі хацеў прыехаць, планаваў паездку на 1969 год, але ажыццявіць яе не паспеў, бо ў згаданым годзе памёр. А вось сын яго, Дзмітрый Андрэевіч, быў тут у 2007 годзе, неўзабаве збіраецца зноў. Цікавіцца каранямі і сын Дзмітрыя, Аляксей — прапраўнук Дастаеўскага. А дастоеўскі захавальнік музея радуецца: у Аляксея было тры дачкі, а год таму нарадзіўся сын — значыць, прамая лінія роду працягнецца.

Дастоеўцы ганарацца сваім знакамітым земляком. Мясцовае сельгаспрадпрыемства яшчэ ў сярэдзіне 1990-х гадоў фінансавала будаўніцтва помніка пісьменніку, які цяпер упрыгожвае вёску. І цяпер вяскоўцы, спасылаючыся на меркаванне замежных гасцей, з задавальненнем паўтараюць, што гэта лепшы з помнікаў, пастаўленых на постсавецкай прасторы Фёдару Дастаеўскаму. Дзякуючы такім энтузіястам, як Анатоль Бурак і яго аднадумцы, пра Дастоева стала пісаць прэса, вёска атрымала вядомасць не толькі ў навуковых колах. Музей наведалі знакамітыя людзі, перадалі ў дар свае творы аўтары-даследчыкі з Расіі і іншых краін.

І вось напрыканцы мінулага года тут прымалі асабліва каштоўны падарунак. Поўны збор твораў Фёдара Міхайлавіча Дастаеўскага ў 18 тамах падарыў Генеральны сакратар ЕўрАзЭС Таір Мансураў. Праўда, каштоўная пасылка ад генсека ўплывовай арганізацыі прыйшла на імя прэм'ер-міністра нашай краіны Міхаіла Мясніковіча. А ганаровую місію ўручэння адрасатам кніг выканаў намеснік міністра культуры РБ Тадэвуш Стружэцкі.

Прыкладна ў той жа час кіраўнік урада Беларусі Міхаіл Мясніковіч з прэм'ерам Расіі (у той час гэтую пасаду займаў Уладзімір Пуцін) абмеркавалі магчымасць аднаўлення сядзібы Дастаеўскіх як культурнага праекта Саюзнай дзяржавы. Была дасягнута прынцыповая дамоўленасць. Зараз, як стала вядома, Міністэрства культуры Беларусі накіравала ў Маскву свае прапановы. Спецыялісты праводзяць узгадненне аб'ёмаў фінансавання. Не выключаецца магчымасць, што да канца гэтага года патрэбныя дакументы будуць падпісаны. Да 2021 года, калі сусветная грамадскасць будзе адзначаць 200-годдзе з дня нараджэння Дастаеўскага, не так і многа.

Паміж вёскамі Дастоева і Вулькай Дастоеўскай, дзе да гэтай пары захаваліся толькі руіны склепа, паявяцца музей класіка ў выглядзе сядзібнага дома, карэтная і канюшня, а таксама гасцініца, кавярня і, абавязкова, капліца.

— Гэта ж які цікавы куток можа атрымацца! — уголас марыць Анатоль Бурак. — Недалёка Варацэвічы з галерэяй Напалеона Орды, да Моталя з яго славутымі музеямі праехаць менш за гадзіну, далей — Моладава з цікавай гісторыяй роду Скірмунтаў... Можна арганізаваць і літаратурны маршрут з уключэннем музея Яўгеніі Янішчыц. Цяпер едуць да нас з усіх канцоў, а дадай адпаведную інфраструктуру, турыстаў будзе шмат — толькі паспявай прымаць.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

■ Спорт

# УРОК ВЯЛІКАГА ФУТБОЛА

## ФК «ГОМЕЛЬ» САСТУПІЎ У ГАСЦЯХ «ЛІВЕРПУЛЮ» І ПАКІНУЎ РОЗЫГРЫШ ЛІГІ ЕЎРОПЫ

Пасля першай сустрэчы беларуска-англійскага супрацьстаяння ў сэрцах беларускіх балельшчыкаў заззяла надзея: «А можа, і ў Брытаніі хлопцы згуляюць так нахабна, як і дома?». І сапраўды, у мінулы чацвер у матчы са славутым апанентам каманда Алега Кубарава выглядала не проста годна, а была блізкай да таго, каб ажыццявіць мару — перамагчы славуты «Ліверпуль». Але, на жаль, саступілі 0:1. Гасцявы паядынак прайшоў цалкам пад кантролем англічан. Пад падтрымку заўзятараў на родным «Энфілдзе» яны дзейнічалі раскавана, вынаходліва. У выніку табло засведчыла лік 3:0 на карысць гаспадароў, чым сапраўды ўсцешыла мясцовых фанаў. Пачынаць сезон дома з упэўненай перамогі прыемна ў любым выпадку.

— Гэта яшчэ адзін урок вялікага футбола і для мяне, і для ўсёй каманды, — прызнаўся пасля гульні Алег Кубараў, галоўны трэнер «Гомеля». — Нават дасведчаны ў футболе, Кашэўскі (капітан каманды. — **Аўт.**) сказаў, што супраць такога нападаючага, як Суарэс, ён яшчэ не гуляў.



Дома «Ліверпуль» цалкам перайграў «Гомель».

Нягледзячы на тое, што бронзавы прызёр мінулага першынства пакінуў Лігу Еўропы, гамяльчане сёлета прадэманстравалі лепшы вынік у гэтым турніры сярод беларусаў. І наваполацкі «Нафтан», і салігорскі «Шахцёр» пакінулі спаборніцтвы яшчэ ў мінулым, 2-м кваліфікацыйным раўндзе. Працягвае еўракубкавую барацьбу толькі чэмпіён — барысаўскі БАТЭ. Між іншым, учора ў швейцарскім Ньёне адбылося лёсаванне плэй-оф Лігі чэмпіёнаў. За квіток у групавую стадыю прэстыжнага турніру наш чэмпіён пазмагаецца з ізраільскім «Хапаэлем» (Кір'ят-Шмона).

**Тарас ШЧЫРЫ**

■ Факт

# ЗАМЕЖНЫХ ТУРЫСТАЎ ЗААХВОЦЯЦЬ НАБЫВАЦЬ БЕЛАРУСКУЮ ПРАДУКЦЫЮ

**З пачатку наступнага года ў Беларусі пачне дзейнічаць сістэма tax-free, згодна з якой замежным турыстам будуць вяртаць ПДВ з тавараў народнага спажывання, набытых імі ў нашай краіне. Пра гэта журналістам падчас відэабрыфінгу на сайце soyuz.by паведаміў дырэктар дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Вадзім КАРМАЗІН.**

Вадзім Кармазін закрануў таксама іншыя напрамкі дзейнасці падначаленага яму дэпартамента. Плануюцца змены ў прававой базе. Так, заняцца агратурызмам у Беларусі будзе значна прасцей. Калі раней патэнцыйны прадпрымальнік павінен быў загадзя мець зямельны ўчастак пад аграсядзібу, дык цяпер дзяржава дапаможа яму гэты ўчастак атрымаць. Беларускія турфірмы, якія займаюцца ўнутраным турызмам, атрымаюць падатковыя льготы (раней такія льготы распаўсюджваліся толькі на ўязны турызм). Аднак для нядобрасумленных турфірмаў гэты варыянт не падыходзіць: з наступнага года такія прадпрымальнікі, хутчэй за ўсё, будуць несці адміністрацыйную адказнасць.

Сярод галоўных планаў на будучыню спадар Кармазін вылучыў стварэнне вялікіх экскурсійных праектаў у межах некалькіх краін. Так, ужо сёлета быў распрацаваны маршрут «Дарогамі вайсковай славы», прысвечаны вайне 1812 года. Першымі экскурсантамі сталі выхаванцы кадэцкіх вучылішчаў. Разам з Расіяй, Польшчай і Літвой вядзецца распрацоўка маршрута «Вялікае бурштынавае кальца». Таксама ў працэсе стварэння і маршрут «З варагаў у рэкі». Большая частка такіх праектаў распрацоўваецца сумесна з Расійскай Федэрацыяй.

Таксама выступоўца адзначыў, што сёлета на беларускім турыстычным рынку назіраецца ажыўленне: усё больш нашых суайчыннікаў едзе на адпачынак за мяжу. Пры гэтым вырасла і колькасць іншаземцаў, якія выбралі для адпачынку Беларусь.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ**

# ВЫЯЗДЖАЕШ? ДАВЕДАЙСЯ!

**Сёлета ў Праграму «Ла Страда» паступіла звыш 200 зваротаў па электроннай пошце. Кожны пяты чалавек цікавіўся выездам за мяжу на пастаяннае месца жыхарства. Мяркуючы па гэтых зваротах, самымі папулярнымі краінамі для беларусаў з'яўляюцца Германія і Расія. Пры гэтым запыт на інфармацыю па Расіі значна павялічыўся ў параўнанні з мінулым годам.**

Праграма «Ла Страда» прадастаўляе электронныя кансультацыі па бяспечным выездзе і знаходжанні за мяжой. Кансультанты адказваюць на пытанні грамадзян, якія паступілі праз спецыяльны раздзел сайта www.lastrada.by або на электронны адрас consultation@lastrada.by. Паводле слоў кіраўніка Праграмы «Ла Страда» Алены НЕСЦЯРУК, грамадзяне, якія эмігрыруюць, цікавяцца вялікай колькасцю пытанняў, і электронныя кансультацыі дазваляюць даць вялікі аб'ём неабходнай інфармацыі. Апошнім часам беларусы цікавяцца і краінамі, якія раней не былі ў фокусе ўвагі — Саудаўскай Аравіяй, Аб'яднанымі Арабскімі Эміратамі, Марока, Катарам, Карыбскімі астравамі, Бахрэйнам, Індыяй, Малайзіяй. Пры гэтым такія краіны, як Бахрэйн і Лівія, цікавяць людзей з пункту гледжання працаўладкавання, а Дамінікана, Мальта і Малайзія выклікаюць пытанні ў тых, хто збіраецца на адпачынак.

Акрамя электроннай пошты, Праграма «Ла Страда» міжнароднага грамадскага аб'яднання «Гендарныя перспектывы» прадастаўляе магчымасць званка па бяспечным выездзе і знаходжанні за мяжой на інфалінію па нумары 113 (з тэрыторыі Беларусі званок бясплатны).

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## ВНИМАНИЮ АКЦИОНЕРОВ ОАО «БЕЛСОЛОД»

11 сентября 2012 г. по адресу г. Иваново, ул. Полевая, 32, состоится внеочередное общее собрание акционеров. Начало работы собрания в 13.30. Время регистрации участников собрания — в день проведения собрания с 12.30 до 13.30. Участникам собрания иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — также доверенность или договор). С информацией (документами) при подготовке к проведению собрания можно ознакомиться с 04 сентября в рабочие дни с 9.00 до 16.00.

**Повестка дня:**

1. Об увеличении уставного фонда путем увеличения номинальной стоимости акций за счет собственных средств Общества.
2. Об утверждении устава Общества в новой редакции.
3. О досрочном прекращении полномочий членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
4. Об избрании нового состава наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
5. О передаче в собственность жилых домов.

Наблюдательный совет.

*УНП 200075434*

# КОЖНЫ НАСТУПНЫ АБ'ЕКТ — ЛЕПШЫ ЗА ПАПЯРЭДНІ

**Роля спецыялізаваных прадпрыемстваў падчас узвядзення як буйных прамысловых, так і жылых аб'ектаў неад'емная. Бо любы сучасны будынак — гэта не толькі фундамент і сцены, але і складаная інжынерная канструкцыя са шматлікімі камунікацыямі. Мантаж сістэм ВОДАЗАБЕСПЯЧЭННЯ і КАНАЛІЗАЦЫІ, АЦЯПЛЕННЯ і ВЕНТЫЛЯЦЫІ, КАНДЫЦЫЯНІРАВАННЯ і ГАЗАЗАБЕСПЯЧЭННЯ, ТЭХНАЛАГІЧНАГА АБСТАЛЯВАННЯ і ТРУБАПРАВОДАЎ вось ужо на працягу больш як трох гадоў паспяхова ажыццяўляе Сантэхнічнае мантажнае ўпраўленне ААТ «Будтрэст № 3 ордэна Кастрычніцкай Рэвалюцыі» горада Салігорска. Нягледзячы на адносна малады ўзрост, калектыву гэтага прадпрыемства пад сілу самыя няпростыя задачы. Дастаткова сказаць, што менавіта праз умелыя рукі высакакласных спецыялістаў СМУ прайшлі такія знакавыя аб'екты нашай краіны, як Нясвіжскі палацава-паркавы ансамбль, лядовыя палацы ў Салігорску і Маладзечне, 5-ы і 6-ы руднікі...**



Начальнік сантэхнічнага мантажнага ўпраўлення ААТ «Будтрэст № 3 ордэна Кастрычніцкай Рэвалюцыі» Уладзімір РАДКЕВІЧ:

**«Для мяне, як кіраўніка, работа прадпрыемства ацэньваецца трыма крытэрыямі: прыбытак, рэнтабельнасць і зарплата».**



*Уладзімір Радкевіч прыйшоў у ААТ «Будтрэст № 3» у 2004 годзе. На той момант на базе СУ-149 ужо працаваў невялікі ўчастак сантэхнічных мантажных работ, які ў 2009 годзе вылучыўся ў самастойнае прадпрыемства — сантэхнічнае мантажнае ўпраўленне. Апошняе пад умелым кіраўніцтвам Уладзіміра Уладзіміравіча за няпоўныя 4 гады далёка прасунулася ў сваім развіцці. Аб гэтым сведчаць у тым ліку неаднаразовыя перамогі ў рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах.*

## НАШЫ ЎЗНАГАРОДЫ

✓ 2010 год. СМУ — прызёр рэспубліканскага конкурсу «На лепшае дасягненне ў будаўнічай галіне Рэспублікі Беларусь» у намінацыі «Лепшая субпадрадная арганізацыя 2009 года».

✓ 2011 і 2012 гг. СМУ — пераможца міжнароднага конкурсу сярод будаўнічых арганізацый СНД на лепшую будаўнічую і праектную арганізацыю, прадпрыемства будаўнічых матэрыялаў і будіндустрыі.

✓ 2011 і 2012 гг. Начальнік СМУ Уладзімір Радкевіч — пераможца конкурсу «На лепшае дасягненне ў будаўнічай галіне Рэспублікі Беларусь» у намінацыі «Кіраўнік года».

## ПРА ІСТОТНЫЯ АБ'ЁМЫ І ДАСТОЙНУЮ ЗАРПЛАТУ

Сантэхнічнае мантажнае ўпраўленне выконвае не толькі тыя аб'ёмы, якія прапануе сёння ААТ «Будтрэст № 3», але і працуе па прамых дагаворах з рознымі, у тым ліку і замежнымі, прадпрыемствамі і фірмамі.

— З кожным годам мы прыбаўляем у аб'ёмах, — распавядае Уладзімір Радкевіч. — Так, у 2009 годзе зарабілі 17 млрд, праз год — ужо 32 млрд, пасля — 52 млрд. Сёлета ж плануем выйсці на 100 млрд. Як бачыце, не стаім на месцы і не збіраемся спыняцца на дасягнутых выніках. Бо ўсе дасягненні — гэта ўчарашні дзень. Мяне, як кіраўніка, больш хвалюе, што будзе сёння і заўтра. Безумоўна, прыемна атрымліваць граматы, дыпломы. Але ўзнагароды — не самамэта. Калі будзе загрузка нармальная, то і граматы з дыпломамі не прымусяць сябе чакаць.

Кіраўнік прадпрыемства прызнаўся, што для яго важна, каб людзі не бегалі з арганізацыі ў арганізацыю, а стабільна працавалі ў СМУ. Для гэтага ж трэба даць ім дастойную зарплату.

— Калі адбылося падзенне курсу долара — у нас сярэдняя зарплата зменшылася ў тры разы — да 300 долараў. Я асцерагаўся, што людзі разбягуцца, пачнуць шукаць новую працу. Прасіў іх пацярпець. Работнікі разумелі, бралі водпуск за свой кошт. Сёння магу сказаць, што 95% калектыву захавалася. Нам спатрэбіўся год, каб перажыць крызіс і дасягнуць той зарплаты, якая была год таму. Так, у ліпені сярэдняя зарплата па ўпраўленні склала амаль 7 млн. Да канца года плануем выйсці на больш высокі ўзровень. Калі рабочыя будуць зарабляць 1000 долараў, то ніякая Расія ім не будзе патрэбна.

## ПРА ЎЛАСНЫ ЦЭХ ПА ВЫТВОРЧАСЦІ САНТЭХНАРЫХТОВАК

Паводле слоў Уладзіміра Радкевіча, за апошнія 3 гады праведзена вялікая работа ў плане атрымання ўсіх магчымых ліцэнзій, якія сёння існуюць па сантэхнічных работах. Не шкадуе кіраўніцтва грошы і на развіццё: пастаянна набывае новае высокатэхналагічнае абсталяванне: усемагчымыя прэсы, насосы, станкі... Вялікай падтрымкай для прадпрыемства, безумоўна, з'яўляецца і ўласны цэх па вытворчасці сантэхнарыхтовак.



Галоўны інжынер Андрэй ВЕЛІГАН (справа) і начальнік ВТА Дзмітрый СТАРАЖЭНКА.

**Андрэй ВЕЛІГАН, галоўны інжынер, лепшы рацыяналізатар Салігорскага раёна-2011:**

— Калі раней мы закуплялі ўсе сантэхнарыхтоўкі на заводзе, то цяпер стараемся вырабляць іх у цэху сваімі сіламі. Набываем толькі сыравіну: трубы, метал, металапрофіль. Гэта робіць упраўленне больш мабільным. Бо мы ні ад каго не залежым, калі стаіць пытанне, што трэба нейкую дэталь зрабіць вельмі хутка. Уласнай вытворчасцю, зразумела, лягчэй кіраваць.

**Аляксандр ДРОБЫШ, начальнік цэха па вытворчасці сантэхнарыхтовак, лепшы малады рацыяналізатар Салігорскага раёна-2011:**

— Мы не толькі забяспечваем упраўленне якаснымі сантэхнарыхтоўкамі, але і прыдумляем і распрацоўваем спецыяльныя прыстасаванні для іх вытворчасці. Пачыналі з малога, з вырабу нарыхтовак толькі для ацяплення, водаправода. Цяпер ужо перайшлі на выраб каналізацыі, вентыляцыі, асвоілі і пачалі рабіць стойлы для пераўзбраення даільных комплексаў. Плануем набыць станок па плазменнай рэзцы. Будзем нарошчваць тэмпы. Мяркую, праз год-два цэх зможа пашырыцца і пахваліцца новымі дасягненнямі.



Брыгада Аляксандра ДРОБЫША (злева): Валерый БУЛЫГА, Дзяніс МІРОНАЎ, Павел ЛІХАЛАП, Яўген САЛАНОВІЧ.

## ПРА ЗНАКАВЫЯ АБ'ЕКТЫ І НОВЫЯ ТЭХНАЛОГІІ



Брыгада мантажнікаў сантэхнічных сістэм абмяркоўвае парадак мантажу вентыляцыі і сістэмы холадазабеспячэння. На першым плане майстар Аляксандр ЗАСТРОЖЫН (у цэнтры) і брыгадзір Дзмітрый ТРУХАН (справа).

За тры гады ўпраўленне паспела папрацаваць на многіх важных будоўлях Беларусі. Пры гэтым ні складанасць, ні ўнікальнасць праектаў не пужаюць спецыялістаў СМУ. Наадварот, цяжкасці падахвочваюць іх да развіцця, прымушаюць адточваць майстэрства, асвойваць новыя тэхналогіі.

Так, своеасаблівым выпрабаваннем на сталасць стаў удзел прадпрыемства ва ўзвядзенні спартыўна-забаўляльных цэнтраў з лядовай арэнай у Салігорску і Маладзечне. Гэта былі складаныя з інжынернага пункту гледжання аб'екты. На долю СМУ выпала самая адказная місія — мантаж важнейшых камунікацый: прытокававыцяжной вентыляцыі арэны і глядзельнай залы, усіх сантэхнічных сістэм лядовых палацаў, басейна з элементамі аквапарку, сістэмы холадазабеспячэння лядовага поля.

— Шчыра кажучы, было прыемна, калі сёлета патэлефанавалі калегі з Мінска, каб пракансультавацца з намі па пляцоўцы лядовага поля, — кажа Уладзімір Радкевіч. — Удзельнічалі нашы спецыялісты і ў рэканструкцыі палацава-паркавага ансамбля ў Нясвіжы. У гэтым гістарычным будынку каля 16 кіламетраў падлог з медных труб — падобная сістэма ацяплення памяшканняў сама па сабе ўнікальная.

На рахунку калектыву сантэхнічнага мантажнага ўпраўлення таксама будаўніцтва медыцынскіх установаў, дзе выключную важнасць мае вентыляцыя. Яна павінна працаваць вельмі эфектыўна, каб забяспечваць неабходны мікраклімат і стэрыльнасць у памяшканнях. Унікальныя сістэмы кандыцыяніравання, якія чысцяць, награваюць і астуджаюць паветра, былі выкарыстаны пры будаўніцтве аперацыйна-рэанімацыйнага блока са стацыянарам ДУ «Рэспубліканскі медыцынскі цэнтр» Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па вул. Энгельса, 27 і лячэбна-дыягнастычнага корпуса па вул. Энгельса, 25 у Мінску.

Аднаго з лепшых брыгадзіраў — **Яўгена ПАЎЛОВІЧА** — заспелі падчас замены каларыфераў якраз на адным з сацыяльна значных аб'ектаў — у Салігорскай цэнтральнай раённай бальніцы.

— Мы тут, праўда, на заднім фоне, разам з урачамі змагаемся за жыцці людзей, — уступае ў размову Яўген Паўловіч. — Вось памяняем каларыферы, і ў аперацыйных стане больш прахалодна. Узімку ж яны будуць награваць паветра. Вельмі важна, каб хірургу было камфортна падчас аперацыі, каб ён ніякіх памылак не зрабіў. Нашы брыгады ўніверсальныя. Мы робім усё, як многія кажуць, ад раяля да шпількі: і кандыцыянеры, і газ, і ацяпленне... Вядзём аб'ект ад пачатку да канца. У тым ліку і тым, што прыходзім і выконваем увесь комплекс работ, мы і цікавыя заказчыку. Яму не трэба шукаць нікога больш. Стараемся якасна выконваць работу. У мяне вельмі маладая брыгада. Новенькіх навучаю, прывіваю ім гордасць за тую работу, якую яны выконваюць.



Рамонт сістэмы ахаладжвання аперацыйных пакояў Салігорскай ЦРБ вядзе брыгада ў складзе: Генадзя БАНЬКО (у цэнтры), Юрыя ДЗЕСЮКЕВІЧА (злева) і Яўгена ПАЎЛОВІЧА – брыгадзіра мантажнікаў МСТО.

Але не толькі асабліва складаныя аб'екты патрабуюць удзелу высакакласных рабочых. Для будынка звычайнай сярэдняй школы якасны мантаж інжынерных сістэм не менш важны. У Бараўлянах з дапамогай спецыялістаў СМУ, якія забяспечылі поўны комплекс сантэхнічных работ, уведзена ў эксплуатацыю новая школа з самай сучаснай «начынкай». Абсталяваны некалькі спартыўных залаў, басейн, дыскатэка, актавая зала.

Што тычыцца новых тэхналогій, то яшчэ адзін вельмі перспектыўны кірунак — мантаж сістэм пакватэрнага ўліку цяпла. Бо сёння, калі на дзяржаўным узроўні ідзе размова аб усебаковай эканоміі энергарэсурсаў, індывідуальны падыход да арганізацыі ацяплення набывае асаблівую актуальнасць.

— Мы зрабілі ў Салігорску пару цагляных дамоў з лічыльнікамі пакватэрнага ўліку цяпла, — адзначыў Уладзімір Радкевіч. — Гэта адзінкавыя аб'екты, бо з-за больш высокіх цэн, падобныя праекты пакуль не карыстаюцца масавай папулярнасцю. Але з часам, думаю, сітуацыя зменіцца, і нашы людзі пачнуць лічыць свае грошы на пяць гадоў наперад. Плануем заняцца і ўстаноўкай сонечных калектараў на дахах дамоў. У якасці эксперыменту мы сабе на базе паставілі падобны, таму цэлы год маем гарачую ваду, якая награваецца ад сонечнай энергіі.

**— Якімі аб'ектамі ганарыцеся?**

— Кожны аб'ект па-свойму цікавы. Проста адзін больш цікавы ў плане інжынерыі, іншы — менш. Усе аб'екты «Беларуськалія» спецыфічныя: мы працавалі на 5-м рудніку, цяпер на 6-м працуем. Прымалі ўдзел у будаўніцтве спелеалячэбніцы на 120 месцаў у Салігорску. Калі гаварыць пра якасць нашых паслуг, то, згадзіцеся, паказальна, што гарантыйны тэрмін па гасцініцы «Вікторыя» з бізнэс-цэнтрам у Мінску ўжо скончыўся, а мы не маем там ніводнай заўвагі.

**— А якую вы даяце гарантыю?**

— Раней яна была 2 гады, а сёлета павялічылася да 5 гадоў. Стараемся рабіць аб'екты ідэальна. Бо нашы работнікі разумеюць, што лепш зрабіць адразу якасна, чым пасля марнаваць уласны час на ліквідацыю браку. Акрамя таго, яны ўсведамляюць сваю адказнасць за жыцці іншых людзей. Не павінна быць «праколаў», усё павінна функцыянаваць на 100%, асабліва тое, што тычыцца газу, бо гэта бяспека ўсяго будынка.

**— Раскажыце пра бліжэйшыя планы.**

— Планы ў нас грандыёзныя. Скончыць работы ў новым будынку Нацыянальнага алімпійскага камітэта, дабудаваць у Крычаве цэментна-шыферны завод. Спадзяюся на далейшае супрацоўніцтва з СТАА «Алюміній-Тэхна» і пасля таго, як мы выканаем складаны комплекс санітарна-тэхнічных мантажных работ на аб'екце «Цэх прэсавання алюмініевых профіляў па вул. Сяліцкага ў мікрараёне Шабаны». Наперадзе (яшчэ не прыступалі) работы на «БелАЗе» ў Жодзіне і на стадыёне футбольнага клуба БАТЭ ў Барысаве. Будзем працягваць будаваць жылыя дамы ў Салігорску, а таксама, спадзяёмся, прымем удзел ва ўзвядзенні двух новых заводаў на «Беларуськаліі».

## ПРА КВАЛІФІКАВАНЫХ РАБОТНІКАЎ І ПАШЫРЭННЕ ШТАТУ

Адзін з найбольш яркіх паказчыкаў паспяховасці прадпрыемства — павелічэнне колькасці працуючых. Захоўваць, а тым больш павялічваць колькасць работнікаў, — на такі крок пойдзе толькі той кіраўнік, які без страху глядзіць у заўтрашні дзень, разумна ацэньвае перспектывы развіцця галіны.

**Цяпер пад тыя аб'ёмы, што ў нас ёсць, мы можам свабодна прыняць яшчэ 60-70 кваліфікаваных рабочых і даць ім дастойную зарплату. Хутка распачнуцца дзве маштабныя будоўлі ў Жодзіне і Барысаве. Таму запрашаю жыхароў гэтых гарадоў да нас на працу.**

— На момант утварэння ўпраўлення на прадпрыемстве працаваў 121 чалавек, — распавядае Уладзімір Радкевіч. — За гэты час колькасць супрацоўнікаў павялічылася больш чым у 2 разы і сёння складае каля 250 чалавек. Цяпер пад тыя аб'ёмы, што ў нас ёсць, мы можам свабодна прыняць яшчэ 60-70 кваліфікаваных рабочых і даць ім дастойную зарплату. Як я ўжо казаў, хутка распачнуцца дзве маштабныя будоўлі ў Жодзіне і Барысаве. Таму, карыстаючыся магчымасцю, запрашаю жыхароў гэтых гарадоў да нас на працу. Ва ўзвядзенні Лядовага палаца ў Маладзечне таксама прымалі ўдзел мясцовыя спецыялісты. Практыкуем падобную форму работы і сёння на будоўлі ў Крычаве. Пры гэтым па заканчэнні будоўлі мы ад добрых спецыялістаў не адмаўляемся, стараемся і ў далейшым забяспечваць іх работай. За няпоўныя тры гады падабраўся добры калектыў. Хацеў бы адзначыць брыгады Маталыцкага і Карнеева, якія працуюць цяпер на НАКу, брыгады Паўловіча і Дробыша. Наогул усе брыгады працуюць добра. Галоўнае, забяспечыць іх матэрыяламі, інструментамі, выключыць прастоі і працу ў аўральным рэжыме, паставіць перад імі канкрэтныя задачы, стварыць бытавыя ўмовы. Гэта ў спалучэнні з персанальнай адказнасцю кожнага работніка і з'яўляецца асновай для стабільных заробкаў. Хочацца адзначыць таксама галоўнага інжынера, начальніка ўчастка. Наогул усім хочацца падзякаваць, бо кожны работнік адыгрывае ва ўпраўленні сваю важную ролю.

**— Заўтра Дзень будаўніка. Што пажадаеце сваім работнікам напярэдадні прафесійнага свята?**

— Добрых заказчыкаў, якія будуць з разуменнем ставіцца да будаўнікоў, і вялікіх аб'ёмаў. Каб мы ніколі не думалі, як зарабіць рубель. А думалі, як зарабіць 2,3 і 4 рублі. Усім калегам жадаю шчасця, поспехаў ва ўсім. І самае галоўнае — здароўя: будзе здароўе — будуць і аб'ёмы.

❑ ❑ ❑

*Шмат зроблена за тры гады, але яшчэ больш важкія планы наперадзе. Кваліфікаваны калектыў сантэхнічнага мантажнага ўпраўлення гатовы і ў далейшым асвойваць высокатэхналагічныя віды работ, спраўляцца з самымі складанымі задачамі, наладжваць эфектыўнае ўзаемадзеянне з заказчыкамі, дамагацца стабільных аб'ёмаў будаўніча-мантажных работ, утрымліваючы годныя пазіцыі на рынку Рэспублікі Беларусь і за яе межамі. І гэта не пустыя словы, бо для прадпрыемства, дзе начальнік цэніць сваіх падначаленых і клапоціцца пра іх, а калектыў ганарыцца сваім кіраўніком, непасільных задач проста не існуе.*

*УНП 601066748.*

**СМУ ААТ «Будтрэст № 3 ордэна Кастрычніцкай Рэвалюцыі»**
г. Салігорск, праезд Будаўнікоў, 5
тэл. / факс: (0174) 22 55 45, 22 07 80
www.str3.by
e-mail: smu@str3.by



Салігорскі спартыўна-забаўляльны цэнтр.



Калектыў бухгалтэрыі злева направа: Зоя КУЛАКОЎСКАЯ, Святлана ГАЎРЫЛЕНКА, Тацццяна ЧЫРСКАЯ і Ірына КЕЦКО.



Жылыя дамы ў Салігорску.

# Адкрытае акцыянернае таварыства «Гроднапрамбуд»:
# МАРКА, ГАРАНТЫЯ, ЯКАСЦЬ

*На будаўнічым рынку Беларусі адкрытае акцыянернае таварыства «Гроднапрамбуд» ужо 68 гадоў. Пасля вызвалення Гродна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў горад ляжаў у руінах. Паўстала задача адбудаваць нанава жыллё, прамысловыя прадпрыемствы, школы, магазіны. З гэтай мэтай 20 кастрычніка Гродзенскім абласным Саветам было прынята рашэнне «Аб аднаўленні дзейнасці абласнога будаўнічага трэста». За гэты час будтрэст некалькі разоў мяняў назву, рэарганізоўваўся. У 2000 годзе арганізацыя пераўтворана ў ААТ «Гроднапрамбуд».*

## Лепшыя з лепшых

Бадай, у Беларусі няма такіх прадпрыемстваў, якія мелі б столькі ўзнагарод і пашаны, як адкрытае акцыянернае таварыства «Гроднапрамбуд». Толькі за апошнія 10 гадоў ААТ шэсць разоў выходзіла пераможцам спаборніцтва сярод будаўнічых арганізацый краіны з занясеннем на Рэспубліканскую Дошку гонару. Што ні год, то і ўзнагарода. У 2005 годзе — дыплом лаўрэата ў намінацыі «Прадпрыемства года» ў катэгорыі «Генпадрадныя арганізацыі» па выніках работы за 2004-ы сярод арганізацый будаўнічага комплексу Беларусі. У 2006-м — дыплом лаўрэата прэміі ўрада Рэспублікі Беларусь за дасягненне ў галіне якасці за 2005 год. У 2007-м — Ганаровы дыплом пераможцы ў намінацыі «Арганізацыя года» ў катэгорыі «Генпадрадныя арганізацыі сярод арганізацый будкомплексу Рэспублікі Беларусь. У 2008-м прадпрыемства ўзнагароджана Ганаровым дыпломам пераможцы ў намінацыі «Тэхналогіі года», у 2010-м стала пераможцам у намінацыі «Кіраўнік года», у 2012-м атрымала Ганаровы дыплом пераможцы ў намінацыі «Арганізацыя года».

ААТ «Гроднапрамбуд» мае ліцэнзіі на выкананне работ па праектаванні і ўзвядзенні будынкаў і збудаванняў I i II узроўняў адказнасці, якая ўключае ўсе віды будаўніча-мантажных работ, рэканструкцыю і капітальны рамонт у Беларусі. А таксама валодае ліцэнзіяй на ажыццяўленне дзейнасці па ўзвядзенні будынкаў і збудаванняў на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі.

У чэрвені 2004 года Камітэт па стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі пры Савеце Міністраў Беларусі выдаў ААТ «Гроднапрамбуд» першаму сярод будаўнічых арганізацый Гродзенскай вобласці сертыфікат, які сведчыць, што сістэма менеджменту якасці вытворчасці будаўніча-мантажных работ адпавядае патрабаванням СТБ ІСО 9001-2001. У 2010-м укаранёна сістэма менеджменту якасці праектавання, вытворчасці будаўніча-мантажных і спецыяльных работ на адпаведнасць СТБ ISO 9001-2009. Наяўнасць гэтага сертыфіката з'яўляецца гарантам якасці прадукцыі, сведчыць пра высокі ўзровень культуры фінансава-гаспадарчага і вытворчага механізмаў. У гэтым, бясспрэчна, заслуга генеральнага дырэктара, заслужанага будаўніка Рэспублікі Беларусь Абдулвагаба Ісакавіча Вагабава, усяго калектыву, якому па сілах любыя задачы, што ставіць дзяржава.



**Паважаныя калегі,**
**віншую вас з прафесійным святам — Днём будаўніка!**

**Пра эканамічную стабільнасць у дзяржаве можна гаварыць толькі тады, калі праца і ўменне будаўнікоў запатрабаваны грамадствам. Менавіта вашы прафесіяналізм, вопыт, адказнасць, добрасумленныя адносіны да справы — гарантыя вырашэння пастаўленых перад намі задач. Вы не проста будуеце, вы ўвасабляеце ў жыццё складаныя праекты, укладваючы ў іх сваю душу. Гісторыя гродзенскага рэгіёна напісана менавіта вашымі рукамі і рукамі нашых ветэранаў, якія шмат гадоў аддалі арганізацыі, а зараз знаходзяцца на заслужаным адпачынку. Разам з тым, іх вопыт, прафесіяналізм заўсёды запатрабаваны, на іх прыкладзе вучыцца маладое пакаленне.**

**Дарагія будаўнікі, дзякуючы вашаму неацэннаму асабістаму ўкладу за 68 гадоў на будаўнічым рынку ААТ «Гроднапрамбуд» назапашаны вялікі вопыт будаўніцтва больш чым 2 тысячы аб'ектаў самага разнастайнага прызначэння: прамысловага, жыллёвага, сацыяльна-бытавога, медыцынскага.**

**Часам у вельмі складаных кліматычных умовах, нягледзячы на жару і холад, непагадзь, вы працягваеце ўзводзіць новыя аб'екты, дарогі і масты. Такая работа прызнае толькі прафесіяналаў.**

**Паважаныя калегі, хочацца сардэчна падзякаваць за вашу працу і шчыра пажадаць аптымізму, далейшых прафесіянальных поспехаў, асабістага шчасця і дабрабыту, здароўя вам і вашым блізкім!**

**З павагай, генеральны дырэктар ААТ «Гроднапрамбуд» Абдулвагаб Ісакавіч ВАГАБАЎ, заслужаны будаўнік Рэспублікі Беларусь**

## Унікальныя аб'екты пад сілу толькі прафесіяналам

ААТ «Гроднапрамбуд» — адна з нямногіх беларускіх будаўнічых кампаній, якая прыцягнута да будаўніцтва вытворчай базы першай у Беларусі атамнай электрастанцыі ў Астраўцы.

— Генеральным падрадчыкам з'яўляецца расійская арганізацыя ААТ «Ніжагародская інжынірынгавая кампанія «Атамэнергапраект» (НІАЭП). Мы абраны субпадрадчыкам першага ўзроўню, — расказвае **галоўны інжынер ААТ «Гроднапрамбуд» Валерый ДЗЯДУК.** — Па субпадрадчыках першага ўзроўню, а таксама па будаўніцтве вытворчай базы для ўзвядзення першай айчыннай АЭС былі разыграны лоты. Згодна ім, сёння за намі замацаваны канкрэтныя ўчасткі работы. У прыватнасці, у зоне адміністрацыйна-бытавога комплексу ўзводзім сталовую на 500 месцаў і аўтастаянку. На комплексе механа-мантажных работ будуем корпус кантролю асноўных злучэнняў, інжынерна-лабараторны корпус, аб'яднаны матэрыяльны цэнтральны склад і склад абсталявання, склад кіслот і растваральнікаў, сховішча радыеактыўных ізатопаў. Усяго ж працуем на 9 аб'ектах.

## Што ні праект, то маштаб

Менавіта ААТ «Гроднапрамбуд» даручаюць усе значныя для вобласці і краіны аб'екты. У прыватнасці завяршаецца будаўніцтва Гродзенскай гідраэлектрастанцыі на рацэ Нёман. Гэта складанае гідратэхнічнае збудаванне, фундаментная пліта якога знаходзіцца на 10 метраў ніжэй за ўзровень вады. За час будаўніцтва тут укладзены 83 кубічныя метры бетону, 7,5 тыс. тон арматуры. Работы вяліся ў дзве змены 8 структурнымі падраздзяленнямі таварыства сумесна з чэшскай кампаніяй «Mavel». Распрацоўка і прымяненне самаўшчыльняльнай бетоннай сумесі пры будаўніцтве станцыі дало магчымасць змяніць тэхналогію вытворчасці бетонных работ і дасягнуць зніжэння працоўных затрат і затрат электрычнай энергіі, прымянення механізаванай укладкі спецыяльнымі помпамі, без выкарыстання пад'ёмных кранаў, што дазволіла значна павысіць прадукцыйнасць працы.

Зараз вадасховішча запаўняецца, у жніўні плануецца сумесна з чэшскімі спецыялістамі змантіраваць абсталяванне і запусціць гідратурбіны. Зазначу, што пуск гідраэлектрастанцыі запланаваны ўрадам на канец 2012 года.

Яшчэ адзін маштабны праект рэалізавала ААТ «Гроднапрамбуд» сумесна з кітайскай кампаніяй «CITIC» на ААТ «Красносельскбудматэрыялы». Тут пабудаваны новая тэхналагічная лінія па вытворчасці клінкеру «сухім спосабам» і новае аддзяленне прыёму і перапрацоўкі вугалю. Раней выкарыстоўваўся прыродны газ. Новая тэхналагічная лінія па вытворчасці цэменту разлічана на выпуск 5 000 тон клінкеру ў суткі. Гэта дазволіла павялічыць вытворчасць цэменту і знізіць затраты паліўна-энергетычных рэсурсаў.



Прэм'ер-міністр Міхаіл МЯСНІКОВІЧ на будпляцоўцы ГЭС.

Аб значнасці і грандыёзнасці выкананых работ можна меркаваць па наступным. Аб'ект уключае ў сябе 69 будынкаў і збудаванняў, якія злучаны паміж сабой тэхналагічнымі галерэямі, а таксама асобныя дапаможныя будынкі. Для рэалізацыі праекта былі ўзведзены ўнікальныя па складанасці збудаванні з маналітнага жалезабетону і металаканструкцый вышынёй да 106 метраў над паверхняй і 21 метра ніжэй за ўзровень зямлі. Агульная плошча комплексу — 20 гектараў, дзе ўкладзена 82 000 кубічных метраў маналітнага жалезабетону, змантіравана 11 000 тон металаканструкцый, пабудавана 3,5 км падземных і наземных галерэй з транспарцёрамі, 1,8 км металічных надземных эстакад для тэхналагічных трубаправодаў, 5 км пад' язных чыгуначных пуцей, пракладзена больш як 50 км кабеля сувязі і электразабеспячэння, 30 км вонкавых сетак вода-, газа- і цеплазабеспячэння, каналізацыі.

Гродзенская ГЭС, канец ліпеня 2012 года.



Разам з тым, «Гроднапрамбуд» на будучай АЭС пракладвае дарогі, інжынерныя сеткі — у прыватнасці, каналізацыйныя. А 31 мая пачаліся работы па падрыхтоўцы катлавана для першага энергаблока. Згодна з графікам, работы павінны завяршыцца ў верасні. «Катлаван раздзелены на два блокі, адзін з якіх даручаны нашай арганізацыі. Работы вядуцца тут нават крыху з апераджэннем графіка, — канстатуе Валерый Іванавіч. — Ужо адкрыты два пласты і пачалася праверка геалогіі асновы катлавана. На чарзе — пракладка пластавага дрэнажу, а ў жніўні плануем прыняць для ўкладкі першы бетон. Бетонную падрыхтоўку мяркуем выканаць на катлаване да пачатку маразоў. А ўсяго ж на АЭС яна зойме плошчу ў 73 тыс. квадратных метраў. Гэта вялікі аб'ём».

Акрамя таго, на працягу трох гадоў арганізацыя з'яўляецца генеральным падрадчыкам па будаўніцтве інжынернай інфраструктуры Астраўца. У мінулым годзе прадпрыемства правяло ўнутрыпляцовачныя і магістральныя сеткі, а субпадрадчык узвёў два дамы для будаўнікоў у адным з мікрараёнаў. У другім мікрараёне заканчваецца будаўніцтва камунікацый і добраўпарадкаванне. На думку спецыяліста, прынятае рашэнне па пракладцы камунікацый з наступнай забудовай вельмі правільнае, паколькі дазваляе ўзводзіць жыллё аператыўна і ў сціслыя тэрміны. Тым больш, што колькасць працуючых на АЭС з кожным годам будзе ўзрастаць, а ім патрэбна жыллё. Так што ў перспектыве працы хопіць усім: у гарадку энергетыкаў паралельна з жылымі кварталамі будуць будавацца дзіцячыя садкі, школы, магазіны, кавярні і рэстараны, забаўляльныя аб'екты і аб'екты культуры, гасцініцы. А задзел для гэтага стварыла ААТ «Гроднапрамбуд», пабудаваўшы піянерную базу для ўзвядзення двух мікрараёнаў у горадзе Астравец.



Піянерная база ў г. Астравец.

— Калі параўноўваць, то на якім з трох вышэйзгаданых аб'ектаў было цяжэй працаваць? — пацікавілася ў галоўнага інжынера.

— Кожны па-свойму ўнікальны. Атамная энергетыка падразумявае свае складанасці. Але ўзровень прафесіяналізму нашых спецыялістаў, рабочых вельмі высокі і з упэўненасцю скажу, што яны могуць рашыць любыя задачы, — сказаў ён.

Як адзначыў Валерый Дзядук, апошнім часам у агульным будаўніцтве, што вядзе арганізацыя, пераважае доля прамысловага. Але прадпрыемства ўзводзіць і рэканструюе таксама нямала аб'ектаў сацыяльна-бытавога прызначэння. Гэта школы, дзіцячыя сады, аб'екты аховы здароўя, спартыўныя збудаванні. Будаўніцтва Лядовага палаца ў абласным цэнтры — справа рук працаўнікоў ААТ «Гроднапрамбуд». Прадпрыемства пабудавала паліклініку і дыягнастычны корпус Гродзенскай абласной бальніцы, гарадскія паліклінікі №№ 2, 3, здадзены ў эксплуатацыю абласны псіханеўралагічны дыспансэр з гарадской паліклінікай № 5 і шмат чаго іншага. Цяпер уведзены ў дзеянне хірургічны корпус, кардыялагічны дыспансэр, вядзецца рэканструкцыя абласной інфекцыйнай бальніцы. Зараз узводзяцца аб'екты для пагранічнікаў — у прыватнасці, такі значны, як мытны пераход «Прывалкі».

## Рука дапамогі ў цяжкі час

Прадпрыемства не застаецца ў баку ад ліквідацыі наступстваў тэхнагенных і прыродных катастроф. Зараз па даручэнні прэм'ер-міністра Беларусі Міхаіла Мясніковіча гродзенскія будаўнікі працуюць на аднаўленні школы ў горадзе Крымску, які пацярпеў у выніку затаплення. У 1986—1988 гадах ААТ «Гроднапрамбуд» узводзіла жылыя дамы ў Гомельскай вобласці для людзей, якія сталі ахвярамі аварыі на Чарнобыльскай АЭС. У 90-я гады мінулага стагоддзя здадзены пасёлкі для перасяленцаў з Магілёўскай вобласці ў вёсках Азёры, Луцкаўляны, Пацуі, Мількаўшчына на Гродзеншчыне. У Азёрах па рашэнні мясцовага Савета вуліцу назвалі Гроднапрамбудаўскай. «Так што ў нас ёсць свая вуліца, — не без гонару зазначае **старшыня прафкама Уладзімір ЖАЛЕЗНЯКОВІЧ.** — Нядаўна наведваўся туды, у добрым стане ўказальнікі, нумарацыя дамоў».



Бетонныя работы вядуць будаўнікі БУ-188.

У 1989 годзе было створана будаўнічае ўпраўленне «273 БМА «Гроднапрамбуд» у г. Кіравакане для ліквідацыі наступстваў землятрусу 1988 года ў Арменіі. На працягу двух гадоў гродзенскія спецыялісты аднаўлялі разбураны горад. Як успамінаюць будаўнікі, іх, можна сказаць, паднялі па трывозе, на зборы былі адведзены сціслыя тэрміны. Людзей і тэхніку адпраўлялі самалётамі ваенна-транспартнай авіяцыі. Беларусы за кароткі час пабудавалі ў Арменіі шмат сейсмаўстойлівых жылых дамоў.

Гэтыя і многія іншыя дакументы, фотаздымкі захоўваюцца ў музеі гісторыі прадпрыемства. З кожным годам экспазіцыя пашыраецца, з'яўляюцца новыя экспанаты слаўнай мінуўшчыны і сучаснасці.

## Сацыяльныя гарантыі — людзям

— У ААТ «Гроднапрамбуд» працуе 3,5 тыс. чалавек. Складанасць у тым, што аб'екты раскіданы па ўсёй вобласці, аддалены ад асноўнай базы на дзясяткі, а то і сотні кіламетраў. Тым не менш, і наймальнік, і прафкам пастаянна клапоцяцца пра стварэнне для работнікаў добрых умоў працы, быту, пражывання.

— На гэта не шкадуем грошай, — гаворыць **намеснік генеральнага дырэктара па ідэалагічнай рабоце, кадрах і сацыяльных пытаннях Ігар ЗАЙЧАНКА.** — За апошнія 12 гадоў сфарміравана 7 жыллёва-будаўнічых кааператываў для работнікаў, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Каля 600 чалавек атрымала ў іх кватэры. Цяпер ствараюцца яшчэ два кааператывы на будаўніцтва двух дамоў — на 72 і 66 кватэр у асноўным для маладых сем'яў, якія маюць непаўналетніх дзяцей, а таксама тых, хто пражыў 10 і больш гадоў у інтэрнаце. Але ў арганізацыю пастаянна прыходзяць новыя людзі, і, як правіла, 90% з іх не маюць свайго жылля.

Ахвотным прадастаўляецца інтэрнат. Жыллё, можна сказаць, стрымальны фактар для адтоку кадраў. Пры звальненні трэба выслабаніць месца ў інтэрнаце. Разам з тым, людзі разумеюць, што, працуючы ў арганізацыі, яны з цягам часу могуць абзавесціся асабістым кутком. На будаўніцтва жылля выдзяляецца беспрацэнтная пазыка. Яе памер залежыць ад стажу работы на прадпрыемстве. Бясспрэчна, пазыка не вырашае ўсіх фінансавых праблем, але, як ні круці, дае магчымасць знізіць асабістыя расходы.

— У калектыўным дагаворы прадугледжана шмат сацыяльных гарантый. Напрыклад, пры нараджэнні дзіцяці, уступленні ў шлюб, вяртанні пасля службы ў арміі на папярэдняе месца работы належаць грашовыя выплаты. Калі чалавек ідзе ў адпачынак, яму выдаюцца сродкі на аздараўленне з улікам стажу работы ў акцыянерным таварыстве, — адзначае Ігар Віктаравіч. — Пры дасягненні пенсійнага ўзросту і выхадзе на заслужаны адпачынак выплачваецца да 2 тыс. долараў у эквіваленце. Калі чалавек адпрацаваў звыш пяці гадоў у калектыве, то яму належыць 50 долараў за кожны год працы. Дарэчы, што тычыцца зарплаты, то на прадпрыемстве яна дастойная. У прыватнасці сёння сярэднямесячная — каля 5 млн рублёў.



Хірургічны корпус дзіцячай абласной клінічнай бальніцы.

*УНП 500036537*

## Як падсілкуешся, так і папрацуеш

— Прафсаюзны камітэт і наймальнік працуюць на прынцыпах сацыяльнага партнёрства, паколькі задачы ў нас аднолькавыя. Усе высілкі скіраваны на тое, каб прадпрыемства працавала стабільна, а работнікі мелі добрыя заробкі, бяспечныя ўмовы працы, пражывання, адпачынку. Напрыклад, асаблівая ўвага і прафсаюза, і кіраўніцтва надаецца пытанням харчавання, якія ў нас на пастаянным кантролі. Гарачыя абеды дастаўляем на аб'екты ў спецыяльных тэрмасах. Стравы гатуюцца ў кавярні «Будаўнік», што адкрылася ў 2009 годзе, 50% кошту абедаў даплачвае наймальнік. Ну, а тыя, хто працуе непасрэдна ў горадзе (а гэта работнікі цэнтральнага офіса, завода жалезабетонных канструкцый, вытворча-будаўнічага ўпраўлення «Спецбудмантаж», упраўлення вытворча-тэхнічнай камплектацыі), могуць харчавацца на месцы непасрэдна ў самой кавярні. Акрамя таго, у 2007-м у складзе Гандлёва-камунальнага прадпрыемства ААТ «Гроднапрамбуд» адкрылася кавярня «Верона», дзе работнікі, жыхары і госці горада могуць адпачыць, правесці банкеты, фуршэты, карпаратыўныя вечары, — падзяліўся **старшыня прафсаюзнага камітэта Уладзімір ЖАЛЕЗНЯКОВІЧ.**

Пераняць вопыт па арганізацыі грамадскага харчавання ў ААТ «Гроднапрамбуд» едуць нават калегі. У прыватнасці, нядаўна тут па гэтай тэме адбыўся семінар. Варта дадаць, што ў ААТ «Гроднапрамбуд» дзейнічае свой медыцынскі пункт, стаматалагічнае аддзяленне, дзе бясплатна можна палячыць зубы, а за паўцаны — пратэзаваць. Да прафесійнага свята Дня будаўнікоў, 8 Сакавіка і работнікам, і пенсіянерам выдаецца прэмія, аказваецца дапамога на закупку агародніны.

У арганізацыі, якая працуе на перспектыву, бясспрэчна, дбаюць і пра падрыхтоўку сваіх кадраў. Рабочых розных спецыяльнасцяў рыхтуе Гродзенскі будаўнічы ліцэй №1. Толькі ў гэтым годзе на работу ў ААТ прыйдуць каля 50 чалавек. Разам з тым, кіраўніцтва імкнецца, каб і самі работнікі пастаянна павышалі сваю кваліфікацыю і веды. Каля 120 чалавек вучацца на завочных аддзяленнях сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў.

— Асноўная задача, якую ставіць сёння генеральны дырэктар перад сваімі намеснікамі, начальнікамі падраздзяленняў, — давядзенне канкрэтных заданняў да кожнага рабочага і штодзённае падвядзенне вынікаў. Чалавек павінен ведаць, колькі заробіць за канкрэтную справу на канкрэтным месцы, — канстатуе **Ігар ЗАЙЧАНКА.** — Гэта нармальны еўрапейскі падыход, калі работнік сам сябе кантралюе, паколькі немагчыма каля кожнага паставіць майстра.

## РУВП «ГРАНІТ»



# ДОБРАЯ ЎСТОЙЛІВАСЦЬ І ВЫДАТНАЯ ПЕРСПЕКТЫВА

**17 кастрычніка 1973 года непадалёк ад цяперашняга горада Мікашэвічы прагучаў узрыў, які абвясціў аб нараджэнні найбуйнейшага ў Беларусі і аднаго з найбуйнейшых у Еўропе кар'ера: у гэтым месцы былі знойдзены вялікія запасы будаўнічага каменю — граніту. А ўжо ў хуткім часе на базе гэтага кар'ера паўстаў завод-гігант — прадпрыемства «Граніт», які стаў выпрацоўваць з гэтага каменю вельмі неабходную для краіны прадукцыю — шчэбень, што ў вялікіх аб'ёмах выкарыстоўваецца будаўнікамі і дарожнікамі.**



Што для наведніка здабыўнога кар'ера мікашэвіцкага прадпрыемства «Граніт» — прыгажосць і экзотыка, тое для работнікаў «Граніта» складае толькі дадатковы галаўны боль... Тэрасы кар'ера, што апаясвалі яго і па якіх поўзалі магутныя БелАЗы, спускаліся шырокімі ўступамі ўніз (зрэшты, па-гарняцку гэтыя тэрасы называюць гарызонтамі), а цераз іх струменілі бурлівыя патокі вады, амаль сапраўдныя вадаспады. Карціна, годная рукі мастака-пейзажыста...

— Аднак уражвае ваш пейзаж, — толькі і сказаў галоўнаму інжынеру «Граніта» Валерыю Батуры, калі мы кружылі па серпанціне пракладзенай у кар'еры дарогі.

— Ды ў нас ад гэтага пейзажу толькі дадатковы клопат, — адказаў той. — Ведаеце, колькі мы вады адпампоўваем з гэтага кар'ера? Штосутачна каля 58 тысяч кубаметраў...

Як далей расказаў і паказаў Валерый Батура, гэтая вада наверсе накіроўваецца ў штучнае вялізнае вадасховішча, у якім адстойваецца, праходзіць працэс натуральнай, прыроднай ачысткі, а ўжо з другога боку вадасховішча скідваецца праз спецыяльны канал у раку Прыпяць. Каб адразу ж закрыць непазбежнае тут пытанне экалагічнага кшталту, адзначым: на прадпрыемстве рэгулярна бяруць пробы вады (на выхадзе з вадасховішча), правяраюць яе ў лабараторыі на наяўнасць шкодных кампанентаў; пастаянна сочыць за гэтым і раённая санэпідэмстанцыя.

Аднак «вернемся» ў кар'ер. Гэта вельмі ўнушальны аб'ект, які раскінуўся на плошчы каля 455 га, ды заглыбіўся ўніз да 150 метраў (ніжняя адзнака — на 10 метраў ніжэй за ўзровень мора).

Гэтыя лічбы ў пэўнай меры характарызуюць запасы гранітнага каменю, які залягае тут амаль суцэльнай масай. Дапоўнім іх яшчэ і наступнымі: у першыя гады існавання прадпрыемства (а яно ўведзена ў эксплуатацыю ў 1975 годзе) з каменю, які пачалі здабываць у гэтым кар'еры, выраблялі каля 6 мільёнаў тон шчэбеню, сёлета павінны вырабіць каля 13 мільёнаў тон. Тым не менш запасаў граніту павінна хапіць прыкладна яшчэ на такі ж тэрмін. Карацей кажучы, будаўнікі (у прыватнасці, заводы жалезабетонных вырабаў), дарожнікі будуць па-ранейшаму няблага забяспечаны гэтым будаўнічым матэрыялам. Варта таксама тут жа падкрэсліць: шчэбень у краіне з'яўляецца, па сутнасці, стратэгічным таварам, ён да гэтага часу практычна ўвесь строга размяркоўваецца. Патрэбнасць краіны ў гэтым будаўнічым матэрыяле асабліва рэзка ўзрастае ў сувязі з будаўніцтвам АЭС.

І яшчэ раз «спусцімся» ў кар'ер. Каб «узяць» гэты маналітны камень, у ім спачатку трэба прасвідраваць спецыяльныя шпуры на глыбіню да 12—14 метраў, закласці ў гэтыя шпуры ўзрыўчатку і, як зразумела ўжо, — узарваць гранітны маналіт. І тут такіх узрываў, па ўсім перыметры кар'ера, праводзіцца за год больш за 100, пры гэтым на кожны з узрываў закладваецца па 100 і больш тон узрыўчаткі.

Зразумела ўжо, здабыча і вываз гэтай горнай масы патрабуюць належнай магутнай тэхнікі. У кар'еры працуюць 5- і 8-кубовыя экскаватары расійскага «Уралмаша», спецыяльныя буравыя станкі; на вывазе каменю штозменна задзейнічаны да 35 БелАЗаў. Зразумела таксама, што ўмовы працы і тэхнікі (і, вядома ж, людзей) — вельмі напружаныя. Парк тэхнікі на «Граніце» пастаянна і істотна абнаўляецца. Так, сёлета тут набылі 12 новых магутных БелАЗаў, адну драбілку (плануецца набыць яшчэ дзве), два экскаватары, бурыльны станок. Зусім жа нядаўна на прадпрыемстве з'явіўся магутны паўднёвакарэйскі экскаватар з гідрамолатам, які ўзяў на сябе частку працы падрыўнікоў: пасля падрыву гранітнай масы нярэдка ўтвараюцца «кавалачкі» вагой па 4—5 тон, у якіх трэба паўторна прабіваць шпуры і ўзрываць іх — цяпер гэтыя кавалачкі вельмі лёгка расколвае той жа гідрамолат, за працай якога мы назіралі разам з галоўным інжынерам. Пазнаёміліся і з машыністам экскаватара. Гэта быў Іван Пракаповіч, які толькі што вярнуўся з будоўляў у Расіі. І адразу ж патрапіў на такую цікавую машыну, першую на «Граніце» з такімі функцыянальнымі магчымасцямі. Зацікаўленым у гэтым новым спецыялісце было і прадпрыемства, на якім іншых спецыялістаў з падобным вопытам не было. Дарэчы, Іван Пракаповіч — «свой», мясцовы; тут жа, на «Граніце», працуе і яго бацька.

❑❑❑

Трыма «кітамі», на якіх трымаецца «Граніт», называюць тут кар'ер, аўтатранспартнае прадпрыемства і драбільна-сартавальны завод. З работай кар'ера мы ўжо крыху пазнаёміліся, варта толькі дадаць: 35 тысяч тон горнай масы штосутачна адгружае кар'ер. А цяпер непасрэдна пра працу аўтатранспартнікаў «Граніта». Пра гэта расказаў начальнік аўтатранспартнага прадпрыемства Аляксандр Кіслюк:

— Сёння ў нас 200 адзінак тэхнікі, з яе — 50 вялікагрузных машын, БелАЗаў. Гэта ў асноўным 55-тонныя машыны, але ўжо ёсць і 8 60-тонных. За кожным БелАЗам замацаваны па 4 чалавекі, працуем кругласутачна, уключаючы суботы і нядзелі, у 4 змены. Усяго на БелАЗах працуюць 192 вадзіцелі. Сярэдняя заработная плата ў сярэднім па аўтапарку складае 6 млн 100 тыс. рублёў, а ў вадзіцеляў БелАЗаў (у прыватнасці, у чэрвені) яна дасягнула 8 млн 334 тыс. рублёў. Наша тэхніка заўсёды ў добрым тэхнічным стане. Так, каэфіцыенты тэхнічнай гатоўнасці аўтапарка і выпуску тэхнікі на лінію складаюць, адпаведна, 0,9 і 0,72; гадавы грузаабарот перавышае 60 мільёнаў тона-кіламетраў. У перспектыве — будаўніцтва новай мыйкі для аўтамабіляў, а таксама боксаў для іх захоўвання і рамонту...



❑❑❑

З кар'ера камень дастаўляецца на драбільна-сартавальную вытворчасць. Тут гэты паўфабрыкат праходзіць тры стадыі апрацоўкі. На першай стадыі драбілка прымае граніт непасрэдна з машын, ці дакладней, — з сілкавальніка, куды яго выгружаюць. З яе камень выходзіць з максімальнай таўшчынёй да 300 мм. На наступнай стадыі ён здрабняецца да 110 мм і менш, і нарэшце на трэцяй стадыі на заводзе атрымліваюць шчэбень. Далей ён сартуецца па фракцыях (па 5—10 мм, 5—20, 10—20, 20—40, 40—70 міліметраў) і паступае на адгрузку або на склад. Найбольш адказны элемент драбільных машын — пласціны са спецыяльнай марганцавай сталі, якія, дарэчы, штомесяц трэба мяняць: мікашэвіцкі шчэбень — вельмі цвёрды і даволі хутка сцірае зубцы пласцін. Між іншым, высокая цвёрдасць мікашэвіцкага граніту абумоўлівае і высокую якасць канчатковага прадукту — шчэбеню. Новымі пласцінамі для драбілак у значнай ступені забяспечвае свой жа ліцейна-механічны завод «Граніта».

А цяпер паслухаем начальніка вытворчасці драбільна-сартавальнага завода Сяргея Міхайлава:

— Наш завод складаецца з 5 цэхаў і 2 участкаў, працуе на ім 830 чалавек. Выробляем 13 відаў прадукцыі (гэта шчэбень розных фракцый); і нават адсеў шчэбеню, які ўтвараецца падчас тэхпрацэсу, рассейваем на фракцыі і прадаём (у прыватнасці, гэта фракцыі 0—0,63, 0,63—2,5, 2,5—5,0). Нашы аб'ёмы сёлета, з уводам на прадпрыемстве новай тэхналагічнай лініі, прырасьлі на 2300 тысяч тон (пра новую лінію будзе яшчэ сказана ніжэй). Але гэтыя планы цалкам выканальныя пры зладжанай рабоце калектыву, пры добрым узаемадзеянні з нашымі, па сутнасці, галоўнымі партнёрамі — чыгуначнікамі. Зразумела ўжо, асноўную частку гэтай прадукцыі мы адпраўляем чыгункай. Акрамя таго — аўтатранспартам (штодзень па 8—10 тысяч тон) і водным шляхам (за дзень па 3—5 тысяч тон). Ад нас да Прыпяці пракладзены спецыяльны канал, па якім наш шчэбень і паступае на рачныя прычалы Прыпяці.

❑❑❑

Хоць і не «кітом», але вельмі важным падраздзяленнем лічаць на прадпрыемстве і электрацэх, які ўзначальвае Сямён Ляўковіч (ён — дэпутат двух Саветаў — Мікашэвіцкага гарадскога і Лунінецкага раённага).

— Я вельмі раўніва стаўлюся да забеспячэння прадпрыемства электраэнергіяй, — казаў падчас гутаркі Сяргей Ляўковіч. — Калі б яе недзе раптам не стала — гэта трагедыя. Электраэнергія для прадпрыемства — гэта яго жыццё. Нашу службу часам лічаць дапаможнай, а я лічу, што электрацэх — гэта сэрца «Граніта», і ў першую чаргу менавіта яно павінна працаваць без збояў. Мы пастаянна трымаем руку на пульсе прадпрыемства, імкнёмся любую аўральную сітуацыю папярэдзіць. У нас у электрацэху ўсяго 45 чалавек, але мы абслугоўваем і ўсё горнае абсталяванне (вядома, па электрычнай частцы), а гэта буравыя станкі, экскаватары, якія практычна ўсе маюць электрычную цягу, а таксама канвееры завода. А яшчэ прыглядваем за Палацам культуры, санаторыем, фізкультурна-аздараўленчым комплексам і іншымі аб'ектамі прадпрыемства. Усе электрасеткі, як знешнія, так і падземныя, вядома ж, таксама нашы. У нас вельмі шмат абсталявання, за якім пастаянна трэба сачыць. Гэта — і эканомія, і меншы расход электраэнергіі. Увогуле, прадпрыемства спажывае за дзень каля 250 тысяч кілават-гадзін электраэнергіі, за месяц — каля 7 мільёнаў. Гэта — нямала, наша вытворчасць лічыцца энергаёмістай. Як знізіць гэтую энергаёмістасць? На прадпрыемстве складзена праграма па энергазберажэнні. Важнае месца ў гэтай праграме адводзіцца таму, каб больш выкарыстоўваць час, у які на энергаспажыванне ўведзены паніжаны, больш выгадны тарыф. Зразумела, мы такім чынам зніжаем сабекошт нашай прадукцыі, у цэлым робім нашу вытворчасць больш таннай.

❑❑❑

Ужо са сказанага вышэй добра зразумела: праца немалога калектыву «Граніта» (а налічваецца на ім каля 3 тысяч чалавек) вызначаецца добрай устойлівасцю. Гэта пацвярджаюць і адпаведныя тэхніка-эканамічныя паказчыкі: за першае паўгоддзе аб'ём прамысловай вытворчасці прадпрыемства ў сённяшніх цэнах склаў да аналагічнага леташняга перыяду 195,8 працэнта. Яно, паводле слоў галоўнага эканаміста Аляксея Люста, задавальняе практычна ўсе патрэбнасці ў яго прадукцыі ўнутранага рынку, разам з тым, адпраўляе частку сваёй прадукцыі і на экспарт. У прыватнасці, за паўгоддзе экспартных паставак зроблена на суму 10,5 млн долараў, што складае 207 працэнтаў да адпаведнага перыяду мінулага года; сальда экспарту-імпарту — станоўчае і складае каля 4,1 млн долараў. Прадпрыемства значна павялічыла прадукцыйнасць працы па валавым дабаўленым кошце: яе тэмпы адносна мінулага года — 177,3 працэнта. За ліпень сярэдняя заработная плата па прадпрыемстве склала 5 млн 341 тыс. рублёў. Чысты прыбытак, паводле слоў галоўнага эканаміста, адносна невялікі — 6,5 млрд рублёў.

А адным з найбольш важкіх дасягненняў гэтага года з'явіўся ўвод у эксплуатацыю новай, 5-й тэхналагічнай лініі па вырабе шчэбеню. Прычым узвядзенне гэтай лініі практычна поўнасцю прафінансавана самім прадпрыемствам, дзяржаўная падтрымка датычылася ўсяго гарантый урада адносна забеспячэння абавязацельстваў прадпрыемства па банкаўскіх крэдытах, якія яму, адпаведна, прыйшлося ўзяць.

❑❑❑

Увогуле, 5-я тэхналагічная лінія па вырабе шчэбеню была на прадпрыемстве доўгачаканым аб'ектам. Рашэнне аб яе будаўніцтве было прынята яшчэ ў 1991 годзе. І спачатку яно ішло хуткімі тэмпамі, але потым затармазілася, а ў 1995 годзе было ўвогуле спынена. Пытанне аб аднаўленні гэтай будоўлі паўстала ў сувязі з ростам у рэспубліцы аб'ёмаў будаўніцтва. «Граніт» стаў адным з асноўных удзельнікаў адпаведнага праекта, ва ўзвядзенні новай лініі ўдзельнічалі таксама многія спецыялізаваныя будаўнічыя арганізацыі рэспублікі («Прамтэхмантаж», «Белэлектрамантаж» і іншыя), тэхналагічнае абсталяванне паставіў расійскі «Уралмаш». Гэта быў грандыёзны і маштабны аб'ект, пра што сведчыць наступны факт: на яго ўзвядзенні штодзённа было задзейнічана да 500 з лішнім чалавек; яго будаўніцтва было разлічана на 17 месяцаў (справіліся за 11). Пры гэтым быў выкананы мантаж 40 канвеераў, 7 аспірацыйных установак, некалькіх падстанцый па энергазабеспячэнні, пабудаваны карпусы драблення шчэбеню,чатыры вузлы яго сартавання, тры вузлы пагрузкі... 5-я тэхналагічная лінія разлічана на гадавы выпуск нярудных матэрыялаў у аб'ёме 3900 тысяч тон, у тым ліку 3000 тысяч тон шчэбеню. Яе ўвод дазволіў стварыць каля 100 дадатковых працоўных месцаў, а галоўнае — гарантаваць перспектыўнае развіццё прадпрыемства. Як працуе 5-я тэхналагічная лінія цяпер? Як зазначаюць на прадпрыемстве, яна яшчэ пакуль што знаходзіцца ў пусканаладачным рэжыме (выявіліся некаторыя нестыкоўкі абсталявання па яго магутнасці), але ўжо хутка яна павінна быць задзейнічана на поўную магутнасць. З выхадам 5-й лініі на запланаваную магутнасць «Граніт» будзе здольны выдаваць шчэбеню да 16 мільёнаў тон за год.

❑❑❑

Перспектыву свайго далейшага развіцця на прадпрыемстве бачаць і ў асваенні новага радовішча граніту, якое знаходзіцца адносна недалёка ад цяперашняй вытворчасці, каля вёскі Сітніца. Цяпер там працягваюцца геолага-разведачныя работы, распрацоўваецца праектная дакументацыя; на базе «Граніта» створаны сітніцкі філіял «Дыярыт». Узвядзенне новага прадпрыемства мяркуецца ажыццявіць за кошт сродкаў ААТ «Банк развіцця». У адпаведнасці з бізнэс-планам ужо ў 2015 годзе на базе новага радовішча павінна быць атрымана першая прадукцыя. Як мяркуецца, магутнасць новага прадпрыемства — 9 мільёнаў тон шчэбеню за год. Як зазначаюць на «Граніце», увод яго дазволіць поўнасцю забяспечыць павялічаную патрэбнасць краіны ў шчэбені, звязаную з будаўніцтвам АЭС. Плюс да гэтага на прадпрыемстве ў большай меры змогуць рэалізаваць свае экспартныя магчымасці. Рэалізацыя гэтага праекта, як зазначаюць на прадпрыемстве «Граніт», увогуле будзе садзейнічаць яго далейшаму працвітанню. Як плануецца, кошт гэтага праекта — каля 2 трыльёнаў 800 мільярдаў рублёў.

❑❑❑

Добрая слава мікашэвіцкага «Граніта» мае ў сваіх вытоках не толькі клопат пра тое, каб, безумоўна, забяспечыць сваёй прадукцыяй усіх шматлікіх заказчыкаў, кліентаў, але і пастаянны клопат калектыву пра якасць гэтай прадукцыі. Яшчэ ў 2003 годзе тут уведзена і паспяхова функцыянуе сістэма менеджменту якасці. А напярэдадні 2011 года натыфікаваны орган ЕС выдаў прадпрыемству спецыяльны сертыфікат еўрапейскага ўзору, які дазваляе яму маркіраваць сваю прадукцыю знакам «СЕ», а гэта, па сутнасці, абазначае бесперашкодны ўваход на рынкі заходнееўрапейскіх краін. Пра многае таксама сведчыць той факт, што мікашэвіцкае прадпрыемства «Граніт» на працягу трох апошніх гадоў выходзіла пераможцам рэспубліканскага конкурсу «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь» у намінацыі «Прадукцыя вытворчага прызначэння». Добрая праца калектыву адзначана і многімі раённымі і абласнымі ўзнагародамі. Пры гэтым варта тут жа нагадаць: грашовыя паступленні «Граніта» складаюць палову Лунінецкага раённага бюджэту.



❑❑❑

На «Граніце» ўмеюць не толькі добра працаваць, але і добра адпачываць. Прычым для гэтага тут існуюць самыя спрыяльныя ўмовы. На прадпрыемстве створана маштабная сацыяльная інфраструктура, якая ўключае ў сябе фізкультурна-аздараўленчы комплекс, Палац культуры, плавальны басейн, прафілакторый і іншыя аб'екты. Асаблівая ўвага — прыцягненню працаўнікоў прадпрыемства да заняткаў спортам. І гэта тут удаецца. Варта пагартаць невялікую інфармацыйную газету прадпрыемства «Граніт-Агляд» — у ёй амаль у кожным нумары паведамленні пра тыя ці іншыя спартыўныя поспехі прадстаўнікоў калектыву. На прадпрыемстве традыцыйна праходзіць круглагадовая спартакіяда па 12 відах спорту, у якой удзельнічаюць больш за 2 тысячы чалавек, практычна ўсе. Чатыры гады запар калектыў прадпрыемства станавіўся пераможцам рэспубліканскага агляду-конкурсу на лепшую арганізацыю фізкультурна-аздараўленчай работы. Дарэчы, варта прыгадаць і пра футбольную каманду прадпрыемства па міні-футболе, якая паспяхова ўдзельнічае ў рэспубліканскім першынстве.

Працаўнікі «Граніта» маюць важкі так званы сацыяльны пакет, які пры гэтым апошнім часам значна пацяжэў, павялічыліся таксама сумы прэміяльных за паспяховую працу. Дарэчы, варта назваць адзін з артыкулаў указанага пакета, не такі ўжо часты ў практыцы: гэта дапамога ў памеры 10 базавых велічынь у тых выпадках, калі чалавек захварэў і вымушаны заплаціць за сваё лячэнне, а адпаведная сума склала больш за мільён рублёў...

Будаўнікі краіны, а разам з імі і працаўнікі «Граніта», адзначаюць у гэтую нядзелю сваё прафесійнае свята. На «Граніце» да гэтага свята традыцыйна назавуць лепшых, ушануюць ветэранаў працы. І практычна ўсіх чакаюць спецыяльныя, да свята, прэміі.

❑❑❑

На заключэнне пазнаёмімся з генеральным дырэктарам «Граніта» Эдуардам Гаўрылковічам. Гэта малады кіраўнік, які зусім нядаўна ўзяў на сябе сваю цяперашнюю нялёгкую ношу. 17 гадоў таму, як ён сам зазначае — «працягваючы працоўную дынастыю», прыйшоў на «Граніт» горнарабочым цэха здабычы; быў электрамеханікам, галоўным энергетыкам кар'ера, галоўным інжынерам прадпрыемства. Ён родам непасрэдна з Мікашэвічаў, і яго, нароўні з клопатам пра камбінат, пра тое, каб прадпрыемства працавала без збояў, а людзі атрымлівалі годную заработную плату, хвалюе таксама лёс роднага горада, у развіццё якога, дарэчы, «Граніт» штогод укладвае немалыя грошы. Вось якія добрыя словы сказаў ён у інтэрв'ю аднаму з перыядычных выданняў: «Я тут нарадзіўся і вырас, а таму хачу бачыць у Мікашэвічах добрыя вуліцы, прыгожыя дамы, сацыяльныя аб'екты, у якіх камфортна было б знаходзіцца людзям»...

Ну, а ўжо праз нашу газету Эдуард Гаўрылковіч шчыра віншуе ўсіх працаўнікоў свайго прадпрыемства, працаўнікоў будаўнічай галіны, сваіх калег з прафесійным святам.

**Іван БАРАНОЎСКІ.**









**На здымках:**

♦ *Генеральны дырэктар прадпрыемства «Граніт» Эдуард Гаўрылковіч.*

♦ *Падчас перадачы на эксплуатацыйныя выпрабаванні шагаючага экскаватара.*

♦ *Прыцягвае да сябе сваім зялёным убраннем заводскі прафілакторый.*

♦ *Панарамныя здымкі, зробленыя ў кар'еры і на самім прадпрыемстве.*

**Фота з архіва прадпрыемства.**

*УНП 200161167*

# Баранавіцкі камбінат ЖБК:

## цаніць чалавека, ганарыцца прадпрыемствам, любіць сваю Радзіму!

## Болей за 40 гадоў на рынку!

***З** ЧАГО складаецца шчасце чалавека? І нават не кажыце мне, што не ведаеце, што гэта філасофскае пытанне. Гэта самае будзённае пытанне, якое толькі можа быць, бо кожны дзень мы спрабуем яго для сябе вырашыць. На маю думку, адзін з галоўных складнікаў нашага шчасця — добрая праца. Проста на ёй мы праводзім ледзь не палову свайго жыцця, а значыць, не можам не зважаць на яе. А згадзіцеся, што калі на працы вас паважаюць, аб вас клапоцяцца, даюць магчымасць развівацца, то і дадому вы прыходзіце з выдатным настроем. У выніку — у сям'і заўсёды спакой і парадак, бо ніхто не нервуецца, дзеці растуць шчаслівыя. І ёсць людзі, якія могуць пахваліцца такой працай. Работнікі Баранавіцкага камбіната жалезабетонных канструкцый сапраўды шчаслівыя людзі, бо з працай ім ужо пашанцавала, а астатняе прыкладзецца.*

## ГАЛОЎНАЕ БАГАЦЦЕ КАМБІНАТА — ЧАЛАВЕК

**ГАЛІНА Каржова, начальнік транспартнага цэха Баранавіцкага камбіната ЖБК і па сумяшчальніцтве старшыня прафкама камбіната, з якой мы прайшлі па тэрыторыі прадпрыемства, завіталі ва ўтульную сталовую, наведалі спартыўную пляцоўку, паведала, што на камбінаце працуе 623 чалавекі, і расказала аб тым, як прадпрыемства клапоціцца аб кожным з іх.**

● Людзі, якія працуюць на прадпрыемстве, — галоўнае багацце, таму адміністрацыя і прафсаюзны камітэт клапоцяцца не толькі аб забеспячэнні кожнага працай і дастойнай заработнай платай. Вельмі важна, каб кожны работнік быў здаровы і мог фізічна і духоўна развівацца. А для гэтага ёсць усе ўмовы. Усе работнікі маюць медыцынскую страхоўку ад няшчаснага выпадку, а каля 80 (у якіх ёсць дыспансэрныя захворванні) — дадаткова застрахаваны на пакрыццё медыцынскіх выдаткаў. Па цотных чыслах працуе стаматалагічны кабінет. Акрамя гэтага, мы маем прыгожую і ўтульную сталовую. З 1 студзеня датацыя на харчаванне была 5000 рублёў, але з 1 ліпеня — гэта ўжо 10 000 рублёў. Кожны дзень больш за палову работнікаў харчуецца ў гэтай сталовай.



Гульня ў валейбол паміж цэхамі.



Утульная і прыгожая сталовая, дзе можа падсілкавацца кожны работнік.

● Трэцяя частка працуючых — гэта моладзь да 31 года. Не кожны з іх мае спецыяльнасць, таму камбінат навучае іх за свой кошт з адрывам ці без адрыву ад вытворчасці.

● На жаль, маладым спецыялістам, якія прыходзяць на працу, мы не даём жыллё, але датуем аплату за здымнае жыллё.

● Гавораць: «Не хлебам адзіным жыве чалавек». Таму мы клапоцімся і аб фізічным, і аб духоўным развіцці нашых работнікаў. На камбінаце абсталявана сучасная валейбольная пляцоўка. Тым не менш, мы дадаткова арандуем залу для гульні ў футбол і валейбол. Шмат аматараў плавання, а таксама тых, хто жадае займацца аэробікай, усходнімі танцамі, ёгай, хадзіць у трэнажорную залу. Мы ўсім даём магчымасць займацца тым, чым яны хочуць. Усе выдаткі на арэнду цалкам аплачвае прафкам. Думаю, дзесьці трэцяя частка людзей задзейнічана ў чым-небудзь. Тыя, хто жадае, ходзяць у кіно, у тэатры, на канцэрты. Некаторыя ездзяць на рыбалку.

● Вяселле, нараджэнне дзіцяці, юбілеі ці, не дай Божа, чыясьці смерць — мы ўсім заўсёды дапамагаем, дзелім з усімі работнікамі камбіната і радасць, і гора.

● Будучыня нашага прадпрыемства — дзеці. Таму вялікая праца праводзіцца з дзецьмі нашых работнікаў. Штогод усе ахвотныя атрымліваюць пуцёўкі. Усе бацькі, дзеці якіх навучаюцца ў школе, атрымліваюць дапамогу ад камбіната да 1 верасня. А маленькія вучні 1-4 класаў прыходзяць да нас на ранішнік «Звініць званок вясёлы», дзе гуляюць і спяваюць, а пасля атрымліваюць падарункі ад прафкама да Дня ведаў. Весела і цікава праходзяць навагоднія ранішнікі.

● Нельга выбудоўваць будучыню камбіната, не ведаючы гісторыі прадпрыемства і не шануючы людзей, якія робяць гэтую гісторыю. Таму мы заўсёды падтрымліваем і шануем пенсіянераў камбіната. Усім ім адміністрацыя аказвае матэрыяльную дапамогу, запрашае на святы.

● Усё гэта толькі невялікая частка таго, што робіцца. Але і гэтае малое сведчыць аб тым, што мы цэнім кожнага работніка камбіната, каб ён ганарыўся сваім прадпрыемствам. А з гэтага і складаецца любоў да Радзімы.



Стаматалагічны кабінет.



Футбольная каманда камбіната на абласной галіновай спартакіядзе.

## Будуйце разам з намі!

**ПРАДУКЦЫЯ Баранавіцкага камбіната жалезабетонных канструкцый запатрабавана ў рэспубліцы і за яе межамі дзякуючы надзейнасці і выдатнай якасці, што пацверджана перамогамі ў рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах. Для павелічэння продажаў сваёй прадукцыі мы бяром актыўны ўдзел у міжнародных спецыялізаваных выставах, якія праводзяцца ў Беларусі і Расіі, размяшчаем інфармацыю аб прадукцыі на інтэрнэтпляцоўках і маем асабісты сайт.**

Сярод рэгалій — званне лепшага ў Беларусі экспарцёра жалезабетонных канструкцый 2010 і 2011 гадоў. Стойкі апор ліній электраперадач і пліты аэрадромных пакрыццяў прызнаны пераможцамі ў конкурсе «Лепшыя будаўнічыя тавары на рынку РФ». На V, VI, VII міжнародных конкурсах на лепшае прадпрыемства па вырабе будаўнічых матэрыялаў краін СНД Баранавіцкі камбінат ЖБК таксама перамог. Летась мы сталі пераможцамі конкурсу ў галіне якасці «Лепшы будаўнічы прадукт 2011 года». Гэтыя перамогі пацвярджаюцца і на практыцы. Сёння прадукцыя камбіната шырока выкарыстоўваецца на многіх будоўлях Беларусі: на будаўніцтве такіх гігантаў, як «Беларуськалій», «Граніт», «Крычаўцэменташыфер». Лагатып Баранавіцкага КЖБК можна ўбачыць і на бар'ерных блоках для праходжання земнаводных пад аўтастрадамі ў Белавежскай пушчы, і на палях, якія пастаўляюцца Кітайскай машынабудаўнічай інжынірынгавай карпарацыі для рэканструкцыі Лукомльскай і Бярозаўскай ДРЭС.

Наша прадпрыемства таксама бярэ ўдзел у будаўніцтве аб'ектаў першай Беларускай атамнай электрастанцыі ў Астравецкім раёне Гродзенскай вобласці: былі пастаўлены дарожныя пліты, палі, калоны, рыгелі, пліты пустотнага насцілу і іншыя віды канструкцый. Вялікім попытам карыстаюцца вырабы камбіната і ў родным горадзе: жылы комплекс на праспекце Машэрава, мікраёен Паўднёвы Захад, індывідуальнае будаўніцтва, Лядовы палац, Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт.

І гэта яшчэ не поўны спіс аб'ектаў, пры будаўніцтве якіх былі выкарыстаны канструкцыі нашага камбіната. Аднак прадукцыя актыўна пастаўляецца і за межы рэспублікі. За 7 месяцаў 2012 года экспарт дасягнуў 7,88 мільёна долараў. Нашы заказчыкі — найбуйнейшыя будаўнічыя фірмы і кампаніі Расійскай Федэрацыі і Прыбалтыкі. Толькі ў Калінінградзе і вобласці з выкарыстаннем вырабаў Баранавіцкага камбіната ЖБК зроблена рэканструкцыя Калінінградскага порта, пабудавана Калінінградская ЦЭЦ-2, прампляцоўка «Аўтатор-Холдынг», вытворчы тэрмінал па перапрацоўцы алейных культур «Садружнасць-Соя», будуецца найбуйнейшы камбікормавы завод у Красназнаменскім раёне. У Наўгародскай вобласці канструкцыі камбіната шырока выкарыстоўваліся на 123-м авіярамонтным заводзе; у Архангельскай — на будаўніцтве новай вытворчасці «Лесазавода 25».

Сёння камбінат мае імідж паспяховага лідара на будаўнічым рынку. Пры любых змяненнях кан'юнктуры на прадпрыемстве здольныя адразу пераарыентаваць вытворчасць на выпуск запатрабаванай прадукцыі. Уся праца Баранавіцкага камбіната жалезабетонных канструкцый арыентавана на спажыўца — задавальняем усе запатрабаванні кліентаў.

*УНП 200166740*

### Асноўныя замежныя партнёры:

***Калінінградская, Маскоўская, Ленінградская, Саратаўская, Тульская, Калужская, Курская, Валагодская, Архангельская, Варонежская, Разанская і іншыя вобласці Расійскай Федэрацыі, а таксама Літва і Латвія.***

### У 2012 годзе спецыялісты прадпрыемства бралі ўдзел у міжнародных выставах:

*— «Фасад-2012» (г. Калінінград, РФ);*
*— «БудТэхЭкспа-2012» (г. Бранск, РФ);*
*— «Садружнасць-2012» (г. Брэст);*
*— «Баранавіцкая вясна-2012»*

**ААТ «Баранавіцкі камбінат жалезабетонных канструкцый»**
225410, Рэспубліка Беларусь, Брэсцкая вобласць, г. Баранавічы, вул. Кірава, 77
Тэл.: (+375 163)
47 06 93
41 52 37
41 57 04
Тэл./факс: (+375 163)
41 52 55
41 50 68
E-mail: bkzhbk@mail.ru
www.zhelezobeton.by

Матэрыялы спецвыпуску падрыхтавалі:
Іван БАРАНОЎСКІ, Надзея ДРЫЛА, Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ,
Уладзіслаў КУЛЕЦКІ, Вольга ГЕЦЭВІЧ, Віктар ПАЗНЯКОЎ, Сяргей КУРКАЧ.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА, Міхаіла ІСАЧЭНКІ.



# ЦЁПЛЫ ЗВОН ДАКУМЕНТАЛЬНАГА КІНО,

## або Чаму рэжысёраў цягне на Палессе?

**Стужку прадстаўніка новай генерацыі беларускіх дакументалістаў Кацярыны МАХАВАЙ «Званар» пра 80-гадовага беларускага званара, зробленую на студыі «Летапіс», адзначылі ўжо не адным прызам. А нядаўна фільм атрымаў яшчэ і Гран-пры ў катэгорыі «Прадзюсарская кампанія» на XVIII Міжнародным фестывалі лакальных тэлеканалаў «Залаты жабрак», які штогод праходзіць у славацкай Кошыцэ. Малады рэжысёр-дакументаліст Кацярына Махава не мае беларускіх каранёў, але яе вельмі цягне ў беларускую глыбінку. У Палессе яна проста закахалася. Кацярына расказала «Звяздзе», адкуль узяўся інтарэс да беларушчыны, як яна кінула мехмат дзеля кіно і чаму «заказныя» фільмы — гэта не заўжды дрэнна.**


Кінарэжысёр Кацярына МАХАВА.

***— Кацярына, рэжысура — гэта ўсё-ткі пераважна цяжкая мужчынская праца. Як так атрымалася, што вы сталі здымаць кіно?***

— Да Акадэміі мастацтваў я вучылася на механіка-матэматычным факультэце БДУ. Сышла з 2-га курса, вырашыла, што гэта не маё. Потым год спрабавала вывучаць дызайн. А потым прыйшла да рэжысуры. Якраз у 2001 годзе быў набор на завочнае аддзяленне на рэжысёраў радыё і тэлебачання. Жаданне стаць рэжысёрам у мяне было. Пасля мехмата я думала паступаць на Вышэйшыя рэжысёрскія курсы ў Маскве. Уяўленні пра рэжысуру ў мяне былі вельмі размытыя. Але я заўжды любіла чытаць сцэнарыі. На 3-м курсе я трапіла на тэлебачанне да Сяргея Кацьера. Мы рабілі фільмы-партрэты, тады ў мяне з'явіўся практычны вопыт стварэння дакументальных фільмаў. Але першапачаткова я марыла пра ігравое кіно. І дыпломны фільм рабіла ігравы.

***— Вы гарадскі чалавек, а вас цягне ў вёску...***

— Я не зусім гарадскі чалавек. Маё дзяцінства прайшло ў маленькіх гарадах. Спачатку мы жылі ў вёсцы пад Краснадарам, потым ва Украіне ў горадзе Оўруч. Потым жылі пад Піцерам у Пушкіне. Калі вучылася ў старэйшых класах, мы пераехалі ў Мінск. Але ў дзяцінстве, напэўна, шмат чаго закладваецца. Мая любоў да маленькіх гарадоў, закінутых паркаў, лесу, відаць, адтуль. Калі я на здымках на Палессі, да мяне вяртаюцца тыя самыя ўспаміны.

***— Вы нарадзіліся ў Расіі. Якія ў вас карані?***

— Беларускіх, на жаль, няма. Але я ніколі не адчувала сябе чалавекам нейкай пэўнай нацыянальнасці. У бацькоў змешаная кроў — грузінская, чувашская, туркменская, руская. Таму нацыянальнае пытанне для мяне ніколі не было вырашальным.

***— У вашых фільмах шмат беларускай мовы, вясковых гаворак. Вы самі разумееце беларускую мову?***

— Калі я вучылася ў Акадэміі мастацтваў, вывучала беларускую літаратуру. Я чытала шмат: Быкаў, Караткевіч. Вельмі моцнае ўражанне зрабіла на мяне творчасць Алеся Разанава. Магчыма, некалі я сама пачну размаўляць па-беларуску.

***— Як атрымалася, што вы закахаліся ў беларускае Палессе, знялі там не адзін фільм?***

— У 2008 годзе я задумала здымаць дакументальны фільм «Коліш» пра бабуль і дзядуляў, якія спяваюць. Хацела знайсці тых герояў, для якіх спевы — частка жыцця. Трапіла на Палессе, там раней спявалі пастаянна, па любой нагодзе. Раней спявалі паўсюль, але на Палессі ўсё незвычайна. Мы паехалі ў экспедыцыю, знаёміліся, шукалі. «Коліш» — таму што бабулі і дзядулі спяваюць колішнія песні. Другі фільм — «Давеку» — таксама быў зняты на Палессі пра скульптара Івана Супрунчыка, які вырабляе драўляныя скульптуры. З ім я пазнаёмілася, калі рабіла «Коліш». Аператар яго ведаў, мы заехалі ў госці, пазнаёміліся, пачалі кантактаваць, і потым з'явілася ўзаемнае жаданне зрабіць фільм. І вось «Званар». Герой — 80-гадовы званар Сцяпан Ерманюк з Дарапеевіч Маларыцкага раёна. Проста па волі лёсу ўсе мае героі — палешукі! У многіх, напэўна, заказное кіно, тэмы, якія прапаноўваюць, выклікаюць пэўныя асацыяцыі. Але тут было ўсё па-іншаму. На «Летапісе» мне прапанавалі гэтую тэму, і яна мяне зацікавіла. Выправіліся ў невялічкую экспедыцыю, знаёміліся са званарамі. Званарскіх традыцый захавалася мала, яны адрозныя ў кожнай мясцовасці. У кожнай вёсцы свой звон. Наогул, Палессе для мяне як дзяржава ў дзяржаве. Свае традыцыі, свой духоўны пласт. Там шмат старажылаў, яны жылі яшчэ ў тыя часы, калі Палессе было адрэзана балотамі ад усяго свету. Таму там зберагі шмат традыцый. На жаль, усё гэта ўжо сыходзіць. Але я закахалася ў гэтыя месцы, у гэтых людзей. Расійскі рэжысёр Марына Разбежкіна казала, што вельмі небяспечна, калі для рэжысёра дакументальнае кіно заканчваецца ў горадзе. Яна сама шмат здымала ў глыбінцы, шукала там герояў. Я думаю, што менавіта ў глыбінцы плённы матэрыял для таго, каб рабіць кіно. Калі здымаеш толькі ў горадзе, дзе ўсё развіваецца і павялічваецца, недзе там, у вёсках, нешта памірае і знікае назаўсёды. Таму трэба спяшацца захаваць хаця б пры дапамозе кіно.


Кадр з фільма Кацярыны Махавай «Званар» (2011).

***— Вы нядаўна вярнуліся з Кошыцэ. Навошта рэжысёрам удзельнічаць у конкурсах і фестывалях?***

— Гэта вельмі развівае. Таму што гэта стасункі з прафесіяналамі з розных краін, знаёмства з працай іншых людзей. Я асабіста неяк падзараджаюся імпэтам рабіць нешта далей. Асабліва, калі фільм заўважаюць, адзначаюць. Гэта натхняе на далейшую працу. Можна, вядома, і проста патусавацца паехаць, таксама бывае плённа. Але гэта не мае дачынення да творчасці. На фестывалі добра ездзіць яшчэ і таму, што ў Беларусі мала паказаў дакументальнага кіно. А фестывалі і конкурсы — цудоўная магчымасць запоўніць гэты прабел.

***— Як успрымаюць беларускую кінадакументалістыку на даволі буйным кошыцкім фестывалі?***

— У цэлым я не памятаю, каб былі размовы пра беларускае кіно. Але ў папярэднія гады беларускія фільмы таксама ўзнагароджвалі. Напрыклад, стужкі Андрэя Куцілы. А гэта сведчыць пра якасць.

***— Якія тэндэнцыі сёння ў сусветнай дакументалістыцы?***

— Нядаўна я была на фестывалі «Залаты Віцязь», там было шмат рускага кіно. Яно вельмі адрозніваецца ад еўрапейскай дакументалістыкі. У еўрапейскім кіно больш гумару, рэальных узаемадзеянняў паміж людзьмі, проста жыцця. Няма пафасу. А ў рускім кіно шмат разваг пра жыццё, пра тое, што адбываецца вакол, нейкай патэтыкі, як усё дрэнна і г.д. Гэта тое, што кідаецца ў вочы. І беларускае кіно таксама да гэтага схільнае. Але я мяркую па нейкай невялікай колькасці фільмаў, не за ўсю сусветную кінадакументалістыку. Вось майго «Званара» як успрымалі: некаму падаецца, што ў фільме шмат бытавых момантаў, маўляў, дзе высокая ідэя? Але гэтыя бытавыя моманты маюць сваю канатацыю. У Кошыцэ, напрыклад, гэта ацанілі.

***— На што б вы ніколі не пайшлі, каб кіно атрымалася добрае?***

— Часта ўзнікала вельмі шмат спрэчных этычных момантаў — адносна нейкіх межаў дазволенага і недазволенага ў дакументальным кіно. Умешвацца ў чыёсьці жыццё, калі чалавек не гатовы і не хоча, у мяне няма ніякага жадання. Для мяне вельмі важна, каб зняць кіно было ўзаемным жаданнем. Альбо, як гэта было на Палессі, калі цябе проста прымаюць і жывуць, як жылі. Я ведаю, што некаторыя рэжысёры ідуць на правакацыі, каб выклікаць нейкую патрэбную ім рэакцыю. Я стараюся мінімальна ўмешвацца ў рэальнасць. Зараз на «Летапісе» раблю новы фільм пра людзей з інваліднасцю і іх тэатр. Галоўныя некалькі герояў — людзі, якія ўпусцілі мяне ў свой свет. Гэта ўзаемна, ім гэта цікава. А ёсць людзі закрытыя, якія не хочуць, і я не настойваю. Для мяне важна, каб гэта была сутворчасць. Кантакт для кінадакументалістыкі — гэта вельмі важна.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**

## Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН**. З дапамогай творчай думкі і ўласнай кемлівасці вы шмат чаго можаце дасягнуць. Не выключана, што нядобразычліўцы паспрабуюць справакаваць вас на канфлікт. Панядзелак — адзіны не самы лёгкі дзень тыдня. Ужо з аўторка поспех пачне спадарожнічаць вам. У пятніцу адбудзецца падзея, якая расчыніць перад вамі новыя дзверы і магчымасці. Да суботы паспрабуйце завяршыць бягучыя справы і вярнуцца дамоў з камандзіроўкі, калі вы з'язджалі.

**ЦЯЛЕЦ**. Вам проста неабходна быць разважлівымі ў дзеяннях і словах. Пошук залатой сярэдзіны наогул павінен стаць асноўным заняткам тыдня. Нават самае нязначнае адхіленне ад стрыманай і прадуманай лініі паводзін прывядзе да вельмі непрыемных наступстваў. Атрымаеце магчымасць уплываць на падзеі найбліжэйшай будучыні.

**БЛІЗНЯТЫ**. Паспрабуйце страсянуцца — вам трэба тэрмінова пазбавіцца ад стану апатыі, а адпачываць на гэтым тыдні ніхто не дазволіць. Не марнуйце дарма каштоўныя хвіліны, паспрабуйце гарманічна ўпісацца ў часавыя цыклы. На пачатку тыдня не спакушайцеся абяцаннямі з фальшывай начынкай. Нядобразычліўцы могуць паспрабаваць устаўляць вам палкі ў колы, праявіце належную пільнасць. Уважлівей і дабрэй стаўцеся да блізкіх людзей, яны маюць патрэбу ў вашай спагадзе.

**РАК**. Спрыяльная праца па індывідуальным плане. Пракладзеныя шляхі і назапашаны досвед не дапамогуць. Паспрабуйце не дапускаць праявы эгаізму ў дачыненні да калег і блізкіх, не будзьце дробязнымі. У суботу атрымаецца вырашыць побытавыя праблемы, якія так доўга адкладаліся і назапашваліся.

**ЛЕЎ**. Спрыяльны перыяд для творчасці і наватарскіх ідэй. Панядзелак удалы для пачатку важных фундаментальных і добрых спраў, у гэты дзень добра пачынаць рамонт у доме ці будаўніцтва. У выхадныя дні магчымыя пэўныя ўскладненні, звязаныя з сям'ёй, зоркі жадаюць вам цярпення.

**ДЗЕВА**. Лепш не планаваць вырашэнне жыццёва важных задач. Добра, калі ёсць магчымасць выкраіць пабольш часу для адпачынку. На працы вам будзе неабходна праявіць усю сабранасць і пунктуальнасць, на якія вы здольныя. Верагодна напружанне адносін з начальствам. Лепш нікуды не спяшацца, падумайце як след, перш чым штосьці сказаць ці распачаць нейкія дзеянні.

**ШАЛІ**. Не пачынайце дзейнічаць, не вызначыўшыся выразна з пастаноўкай мэты, інакш час і сілы будуць выдаткаваны марна. Не вельмі давярайце фактам і лічбам. Калі ваша інтуіцыя пярэчыць прыняццю нават відавочнага рашэння, то да яе варта прыслухацца. Надзвычай вялікія шанцы вырвацца з працоўнай руціны. Пры наяўнасці адпаведнага жадання імі варта скарыстацца.

**СКАРПІЁН**. Дзеля дасягнення высокай мэты давядзецца ахвяраваць вольным часам і ўласнымі планамі. У сераду мусіце ўзяць на сябе арганізатарскую ролю — і тут у вас будзе маса магчымасцяў бліснуць талентамі. Справы лепш весці сумленна і адкрыта: толькі такім чынам вы зможаце пазбегнуць праблем з партнёрамі.

**СТРАЛЕЦ**. Дапамагаючы іншым людзям, вы ўбачыце, як лепш справіцца са сваімі праблемамі. З'явіцца магчымасць адправіцца ў невялікую паездку — кагосьці наведаць, з кімсьці сустрэцца — не грэбуйце ёй. Пры кантактах з дзелавымі партнёрамі могуць паўстаць нечаканыя сітуацыі, якія пацягнуць зусім нестандартныя дзеянні з іх боку. Вашы парады, дадзеныя сваякам, будуць вельмі своечасовымі і могуць дапамагчы ім палепшыць стан здароўя.

**КАЗЯРОГ**. З'явіцца магчымасць для максімальна паспяховай рэалізацыі задуманага. Верагодная неадназначная сітуацыя на працы і ў стасунках з дзелавымі партнёрамі. Давядзецца прымаць даволі рызыкоўныя рашэнні — спачатку падумайце, а толькі потым дзейнічайце, каб не дапусціць памылак.

**ВАДАЛЕЙ**. Па-ранейшаму будзеце ганяцца за поспехам, і лёс вам яго зловіць. Павялічыцца ваш аўтарытэт і творчы патэнцыял. Паспрабуйце пашырыць кантакты, гэта адкрые перад новыя магчымасці з вельмі прывабнымі перспектывамі. Неабходна кантраляваць свае дзеянні. Будзьце асцярожнымі, не прымайце паспешных рашэнняў, не дазваляйце эмоцыям узяць верх.

**РЫБЫ**. З'явяцца магчымасці для кар'ернага росту. Можа здарыцца інфармацыйная перагрузка. Будзьце асцярожнымі з новымі прывабнымі праектамі, яны могуць адцягнуць увагу ад галоўнага. Вучыцеся ўспрымаць па-новаму жыццёвыя сітуацыі.

## Танныя ноўтбукі страчваюць папулярнасць

Сёлета на беларускім рынку ноўтбукаў спажывецкі попыт вырас вышэй за ацэначны, а беларусы сталі больш купляць ноўтбукі з сярэдняга цэнавага дыяпазону, а не з ніжняга. Пра гэта паведамілі ў прадстаўніцтве кампаніі Samsung Electronics Rus у Беларусі. Так, калі летась доля продажаў недарагіх ноўтбукаў Samsung складала каля 80%, то зараз яна знізілася да 50%. На ноўтбукі сярэдняй цэнавой катэгорыі сёлета прыпадае 45%, а яшчэ 5% — на прэміум-сегмент. Цікава таксама, што самымі папулярнымі на рынку мадэлямі ноўтбукаў па ацэнцы спецыялістаў Samsung з'яўляюцца прылады з дыяганаллю экрана 15 цаляў — у 80% выпадкаў нашы грамадзяне купляюць менавіта іх.

Як лічыць менеджар аддзела IT і тэлекома прадстаўніцтва кампаніі Samsung Electronics Rus у Беларусі Аляксей ГОЛУБ, доля «шэрых» ноўтбукаў на беларускім рынку знізілася да 30%. Ён гэта звязвае з умовамі іх увозу ў рэспубліку, якія сталі больш жорсткімі, а таксама з параўнальна невялікай розніцай у кошце паміж «белымі» і «шэрымі» ноўтбукамі.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

## Даты · Падзеі · Людзі

**1795** год — нарадзіўся Валяр'ян Красінскі, гісторык, публіцыст, друкар. Выхадзец з Беларусі. Адукацыю атрымаў на гісторыка-філалагічным факультэце Віленскага ўніверсітэта. У 1828 годзе ў Варшаве пачаў выданне ўніверсальнай энцыклапедыі. Для гэтага набыў неабходнае абсталяванне і заснаваў у Варшаве першую стэрэатыпную друкарню. Першым выданнем быў «Псалтыр Давіда» ў перакладзе Ф. Карпінскага, затым раманы В. Скота, а таксама падручнікі. Усяго надрукаваў каля 50 выданняў, якія прадаваліся непасрэдна з друкарні або праз варшаўскія кніжныя крамы і ў правінцыі. Задуманая Красінскім універсальная энцыклапедыя не змагла выйсці ў свет, надрукавана для пробы толькі некалькі сшыткаў 1-га тома (з-за таго, што пачалося паўстанне 1830-31 гадоў). Пасля задушэння паўстання выехаў з дыпламатычнай місіяй Часовага ўрада ў Англію і на радзіму не вярнуўся.



**1973** год — у 19 гадзін 30 хвілін па Цэнтральным тэлебачанні пачаўся паказ тэлесерыяла «Сямнаццаць імгненняў вясны». У фільме Таццяны Ліёзнавай былі заняты сапраўды зорны акцёрскі ансамбль: Вячаслаў Ціханаў, Расціслаў Плят, Леанід Бранявы, Алег Табакоў, Леў Дураў, Леанід Кураўлёў... Задума кнігі пра разведчыка, укаранёнага ў вышэйшыя нацысцкія структуры, нарадзілася ў КДБ. І яе на вельмі высокім узроўні ўвасобіў пісьменнік Юліян Сямёнаў. Фільм курыраваў сам Андропаў. Атрымалася вельмі пераканаўча, нягледзячы на тое, што савецкага разведчыка, які зрабіў такую кар'еру ў нацысцкім рэйху, у сапраўднасці не існавала. Не было ў гітлераўскай Германіі і такога роду характарыстык, як «сапраўдны арыец; характар нардычны, вытрыманы; бязлітасны да ворагаў рэйха; у сувязях, якія ганьбяць яго, заўважаны не быў» і гэтак далей. Застаецца толькі гадаць, як у КДБ прапусцілі саму назву, бо «Сямнаццаць імгненняў вясны» — гэта радок з песні, якая гучала ў нямецкім фільме «Дзяўчына маёй мары», знятага ў часы Гітлера. Савецкі глядач палюбіў фільм адразу і назаўжды. Адна з прымет народнай любові — незлічонае мноства анекдотаў пра Штырліца і іншых персанажаў карціны. Як сведчыць міліцэйская статыстыка, у час трансляцыі «Імгненняў» у краіне практычна не фіксавалася злачынстваў. У тыя гады літаральна ўсе — ад партыйнага апаратчыка да крымінальнага аўтарытэта, затаіўшы дыханне, назіралі за гераічнай работай палкоўніка Ісаева.

**1952** год — нарадзіўся (вёска Маяк Слуцкага раёна) Мікалай Аляксеевіч Нямковіч, беларускі фізік, доктар фізіка-матэматычных навук (1998). Аўтар навуковых прац па даследаванні і распрацоўцы лазераў на фарбавальніках з электрахімічным кіраваннем частатой генерыраванага святла.

**Было сказана**

**Максім Багдановіч (1891—1917), паэт, перакладчык, літаратурны крытык:**

*«Трэба журыцца душою*
*на свежых магілах пуста*
*пранёсшыхся дзён».*

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

### СЕЗОН НАРЫХТОВАК

## Найсмачнейшыя кабачкі



***Спатрэбіцца***: кабачкі — 3 кг, морква — 4-5 шт., горкі перац — 2 шт., часнок — 100 г, таматная паста — 0,5 л., сланечнікавы алей — 0,5 л, воцат сталовы (9%) — 0,5 л, цукар — 0,5 кг, соль — 2 ст. л., вада — 0,5 л.

Прастэрылізуйце слоікі (прыкладна выходзіць 8 слоікаў па 0,5 л). Парэжце кабачкі кружкамі. Калі кабачкі шырокія, разрэжце іх напалову. Перакруціце на мясарубцы моркву, часнок, горкі перац. У каструлю выкладзіце кабачкі, наверх — сумесь з морквы, горкага перцу, часнаку. Затым дадайце таматную пасту, алей, воцат, цукар, соль, ваду. Перамяшайце.

Варыце 20 хвілін ад моманту закіпання, затым перакладзіце ў слоікі і закатайце.

## Вяленыя памідоры



***Спатрэбіцца***: памідоры свежыя (сярэднія ці дробныя) — 2 кг, соль буйная (ці марская) — 6 ч. л., кроп, пятрушка, маяран, чабор, сельдэрэй, мацярдушка, размарын — па 1 ч. л., часнок — 7 зуб., алей аліўкавы — 200 мл.

Дробныя памідоры разрэзаць напалову, сярэднія — на 4 часткі і лыжкай выдаліць насенне і перагародкі. Выкладваем на ліст, засланы пекарской паперай. Солім і прысыпаем сумессю траў.

Ставім запякаць у духоўку прыкладна на 3—3,5 гадзіны пры тэмпературы ад 100 да 120 градусаў. Пры гэтым дзверцы духоўкі шчыльна не зачыняем, пакідаем шчыліну 1-2 см для выхаду пары. Калі памідоры падсушыліся, складваем іх у стэрыльныя слоічкі і перасыпаем дробна нарэзаным часнаком. Заліваем аліўкавым алеем і трасем, каб выйшла паветра. Захоўваем у халадзільніку.

## Хуткія марынаваныя агурочкі ў зялёным соусе



***Спатрэбіцца***: агуркі свежыя сярэдняй велічыні — 1 кг, часнок — 5-6 зуб., кінза свежая — 1 пуч., кроп свежы — 1 пуч., соевы соус — 200 г, воцатная эсэнцыя — 1 ч. л., перац чорны молаты, цукар — 1 ч. л.

Агурочкі вымыць, зрэзаць кончыкі і парэзаць на 4 часткі. Калі агуркі тоўсценькія — рэжам на 6 частак. Усё складваем у каструльку, дадаем часнок, надзёрты на дробнай тарцы, дробна пасечанае зеляніва са сцяблінкамі. Калі агуркі падаваць адразу, можна надзерці і адзін агурочак. Запраўляем соевым соусам, воцатам і перцам. Колькасць воцату можна рэгуляваць самім на смак ці замяніць лімонным сокам.

-2868-

### УТУЛЬНЫ ДОМ

## Расстаўце акцэнты

Такія дэталі інтэр'еру дачы, як, напрыклад, распісаныя дзверцы кухоннай мэблі, яркі халадзільнік ці арыгінальны кухонны фартух, могуць стаць ударным акцэнтам на кухні і задаць стыль усяму памяшканню. Таму пастаўцеся да ўсяго з фантазіяй. Выкладзіце фартух яркай кафляй ці спалучайце яе з драўлянымі рэйкамі. Распішыце халадзільнік кветкамі, садавіной, гароднінай ці пафарбуйце пад колер кухоннай мэблі. Дзверцы шафаў упрыгожце яркімі малюнкамі, выкарыстоўваючы трафарэты, ці мазаікай з колатага посуду, ці з дапамогай тэхнікі дэкупажу.



Замест дзвярэй выкарыстоўвайце фіранкі з тканіны, а замест скрыняў — прыгожыя кошыкі. Не бойцеся праяўляць фантазію і памятайце, што на дачы любая ручная праца — недасканалая, аляпаватая, але такая мілая — глядзіцца значна больш арганічна, чым сумныя сцены і фабрычная штампоўка.

### РАПТАМ СПАТРЭБІЦЦА

## Як падоўжыць жыццё букету кветак

Заўсёды хочацца, каб падораныя кветкі даўжэй стаялі ў вазе. Існуе мноства спосабаў замарудзіць іх завяданне, аднак многія з іх абсалютна бескарысныя.

Прапануем універсальны варыянт — ён падыдзе практычна для ўсіх кветак. Вам спатрэбіцца: на 1 л вады 2 ч. лыжкі цукру, 2 ч. лыжкі адбельвальніка і 2 ч. лыжкі лімоннага соку. Змясціце ў вазу ўсе інгрэдыенты і размяшайце да поўнага растварэння цукру. Затым падрэжце сцёблы кветак пад невялікім вуглом і пастаўце ў вазу.

Кожныя 3-4 дні змяняйце ваду, паўтараючы ўсю працэдуру нанова.

### ПЕРАЙМАЙ

- Калі мыла перад ужываннем пакласці на суткідвое на батарэю цэнтральнага ацяплення ці печку, яно дасць удвая больш пены.
- Паверхня праса, да якой штосьці прыгарэла, можна працерці анучкай з дробнай соллю.
- Каб навастрыць нажніцы, трэба пастрыгчы імі наждачную паперу, зрабіўшы 6-8 надрэзаў.
- Каб сабраць асколкі шкла, можна выкарыстоўваць змочаную ў вадзе вату. Можна таксама зрабіць шарык з аконнай замазкі ці пластыліну і пакачаць яго па месцы, дзе ляжаць асколкі. Ён убярэ ў сябе нават нябачныя часціцы.

-2869-

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 5.41 | 20.47 | 15.06 |
| Віцебск | — 5.26 | 20.41 | 15.15 |
| Магілёў | — 5.31 | 20.37 | 15.06 |
| Гомель | — 5.33 | 20.29 | 14.56 |
| Гродна | — 5.57 | 21.02 | 15.05 |
| Брэст | — 6.03 | 20.51 | 14.48 |

### Месяц

*Апошняя квадра 9 жніўня.*
*Месяц у сузор'і Блізнятаў.*

### Імяніны

***Пр.** Серафіма, Астапа, Канстанціна, Кузьмы, Міхала, Серафіма.*
***К.** Зузаны, Клары, Луізы, Філамены, Аляксандра, Уладзіміра.*


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**У мяне жонка кожны вечар па барах ходзіць.**
**І кожны раз знаходзіць, зараза.**

— Што робіш?
— Гляджу Алімпіяду, спаборніцтвы па цяжкай атлетыцы.
— Сярод мужчын ці жанчын?
— Пакуль яшчэ не разабраўся.

**Калі мужчыну падабаецца жанчына, ён гатовы дзеля яе на ўсё. А калі ён яе кахае, дык можа нават посуд памыць.**

— Што трэба зрабіць для таго, каб спадарожнікі паспяхова выходзілі на арбіту?
— Адпраўляць іх туды разам з іх распрацоўшчыкамі.


caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 27.631. Індэкс 63850. Зак. № 3616.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 10 жніўня 2012 года.